УДК 070:378.147.091.313(07)
ББК 76.01р30-2я7
К26

Рэкамендавана вучоным саветам
Інстытута журналістыкі БДУ
30 жніўня 2011 г., пратакол № 1

Р э ц э н з е н т ы:
доктар філалагічных навук прафесар *Н. Ц. Фральцова*;
доктар гістарычных навук прафесар *А. Г. Слука*

**Карповіч, М. П.**
К26 Дыпломная работа выпускніка Інстытута журналістыкі БДУ : метад. кампендыум / М. П. Карповіч. – Мінск : БДУ, 2012. – 99 с.
ISBN 978-985-518-678-7.

У метадычным кампендыуме дыпломная работа падаецца як навуковы жанр – на падставе яе сэнсава-структурнай ідэнтычнасці з навуковымі творамі ў жанры манаграфіі, артыкула і інш. На гэтай жа падставе вызначаюцца і абгрунтоўваюцца патрабаванні да навукова-даследчага ўзроўню дыпломнай работы, даецца шэраг рэкамендацый для яго забеспячэння. Паколькі дыпломнае даследаванне выконвае атэстацыйна-кваліфікацыйную функцыю, у кнізе сфармуляваны крытэрыі яго ацэнкі па дзесяцібальнай сістэме.

Выданне прызначана для выпускнікоў Інстытута журналістыкі БДУ, навуковых кіраўнікоў, рэцэнзентаў. Можа быць выкарыстана пры напісанні дыпломнай работы па іншых спецыяльнасцях у галіне гуманітарных навук.

**УДК 070:378.147.091.313(07)**
**ББК 76.01р30-2я7**

**ISBN 978-985-518-678-7**

© Карповіч М. П., 2012
© БДУ, 2012

# ЗМЕСТ

**Слова да чытача** ................................................. 5

**Частка I**

**Дыпломная работа як навуковы жанр** ................................................. 7

Тыпалагічна-відавыя прыметы дыпломнай работы і навуковых выданняў ................................................. 7

Структурна-зместавыя ўласцівасці дыпломнай работы і твораў навуковых жанраў ................................................. 8

Уводная частка. Узор напісання ўводзінаў ................................................. 10

Асноўная частка. Узоры афармлення глаў (фрагменты) ................................................. 17

Заключная частка. Узор напісання заключэння ................................................. 21

**Частка II**

**Навукова-даследчая спецыфіка дыпломнай работы па журналістыцы** ................................................. 24

Прадметная галіна даследавання ................................................. 24

Выбар тэмы ................................................. 26

Навуковы кіраўнік ................................................. 28

Творчая дыпломная работа ................................................. 31

Узоры напісання і афармлення творчай дыпломнай работы (фрагменты) ................................................. 33

Водгук і рэцэнзія ................................................. 52

**Частка III**

**Метадалогія даследавання сучаснай медыясферы** ................................................. 55

Метад – першааснова даследчай дзейнасці ................................................. 55

Кантэнт-аналіз як аб’ектыўны метад навуковага даследавання ................................................. 56

Метады даследавання зместу ................................................. 57

**Частка IV**

**Тэрмінасфера масмедыйных навуковых даследаванняў** ............ 62
Грамадска-палітычная і спецыяльная тэрміналогія ............ 62
Заходнежурналісцкая тэрміналогія ў айчынных СМІ ............ 65
Тэрмін як «кантэкстна нерухомая» лексічная адзінка ............ 67

**Частка V**

**Даведачны апарат дыпломнай работы** ............ 71
Узор тытульнага ліста дыпломнай работы выпускніка факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ............ 72
Афармленне навуковых крыніц у «Спісе выкарыстанай літаратуры» (кніжныя выданні, асобныя артыкулы ў кнізе, газеце, інтэрнэце і інш.) ............ 73
Бібліяграфічныя спасылкі ў тэксце (афармленне) ............ 75
Бібліяграфічны спіс літаратуры па журналісцкай тэматыцы (для першапачатковага выкарыстання аўтарам дыпломнай работы) ............ 76
Дадатак ............ 87
Тэхнічны стандарт дыпломнай работы ............ 87

**Частка VI**

**Крытэрыі ацэнкі дыпломнай работы** ............ 89

**Частка VII**

**Заключэнне** ............ 94

***

**Post scriptum з Умберта Эка** ............ 95

# Слова да чытача

**Шаноўныя выпускнікі Інстытута журналістыкі БДУ!**

Дыпломная работа – гэта ваш апошні атэстацыйны акорд, які будзе пачуты і ацэнены высокім журы – Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй. Заадно і прысутнымі ў аўдыторыі выкладчыкамі, калегамі, сябрамі.

Дзеля вашага творчага поспеху і паразумення паміж намі, вашымі настаўнікамі (навуковымі кіраўнікамі, рэцэнзентамі, членамі камісіі), і вамі, маладымі даследчыкамі, настойліва раю прачытаць гэтую метадычную нататку, дакладней – метадычны нарыс, а найдакладней – метадычны кампендыум (лац. compendium – скарачэнне), што азначае: «сціслы сумарны выклад асноўных палажэнняў якой-небудзь навукі, даследавання і інш.». Менавіта ў гэтым жанры прапануецца метадычны твор па напісанні дыпломнай работы, у аснову якога пакладзены палажэнні, рэкамендацыі, распрацоўкі, якімі кіруюцца аўтарытэтныя навучальныя ўстановы, дзе ёсць факультэты журналістыкі і дыпломная работа з'яўляецца абавязковай формай дзяржаўнай атэстацыі выпускніка (БДУ, МДУ, СПбДУ, МДІМА і інш.). Да прыкладу, падалося мэтазгодным распрацаваць і ўвесці ў нашу практыку крытэрыі ацэнкі дыпломнай работы (па ўзоры СПбДУ), дастасаваўшы іх да нашай дзесяцібальнай сістэмы адзнак; удасканаліць падыходы да напісання дыпломнай работы (творчай) паводле вопыту факультэта міжнароднай журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін (МДІМА); удакладніць некаторыя арганізацыйныя моманты (МДУ), прывесці тэхнічныя стандарты афармлення даведачнага апарату і інш. Ігнараванне вамі выкладзеных патрабаванняў, рэкамендацый можа негатыўна адбіцца на творчай якасці дыпломнага даследавання,

а значыць, і на яго ацэначным бале. Таму ўдумліва прачытайце кожную старонку тэксту метадычнага твора і ўсе яго затэкставыя матэрыялы (узоры, дадаткі), скарыстаўшы знаёмую вам рэдактарскую методыку чытання: спачатку азнаямляльнага, каб узяць правільны накірунак на самым першым этапе падрыхтоўкі дыпломнай работы, затым паглыбленага, асэнсаваўшы кожнае патрабаванне, выкладзенае на гэтых старонках. Апошняе чытанне – кантрольнае, ад першай да апошняй старонкі, скіраванае на прадмет адпаведнасці закончанай дыпломнай работы крытэрыям яе ацэнкі (гл. с. 89–93).

У вучэбна-метадычным дапаможніку падаюцца ўзоры напісання *ўводзінаў*, *заключэння*, афармлення *даведачнага апарату* – тытульнага ліста, зместу, бібліяграфічнага спісу і спасылак на яго, скарачэнняў, прынятых у рабоце, і інш. Узоры ўзяты з дыпломных работ, выкананых вашымі нядаўнімі папярэднікамі пад навуковым кіраўніцтвам аўтара гэтай «метадычкі» і ацэненых экзаменацыйнай камісіяй балам «10». Кніжачка, якая зараз перад вамі, павінна стаць на ўвесь час працы над дыпломнай работай свайго роду «хэндбукам» – кнігай, «якая заўжды пад рукой». Handbook, stylebook – гэта ўласцівыя для практыкі заходняй прэсы найменні падручнікаў, дапаможнікаў, у якіх паводле прынцыпаў і правілаў «рэспектабельных і аўтарытэтных СМІ» рэгламентуецца, штó журналіст павінен рабіць, каб застацца ў межах прафесійнай сістэмы, і чаго рабіць не варта; паведамляецца, якія змены адбыліся ў літаратурнай норме, «бо разнабой у напісанні раздражняе чытача і вядзе да страты аўтарытэту выдання». У падобных падручніках мала тэорыі. У іх сабраны паслядоўныя прагматычныя дзеянні, якія даводзіцца ажыццяўляць на працы кожнаму прафесійнаму журналісту.

Напісаны ў стылі рацыянальных методык, з паслядоўным выкладам жанравых асаблівасцей, правілаў арганізацыі інфармацыйнай сістэмы – ад асноўнага тэксту да даведачнага апарату, наш метадычны кампендыум-хэндбук забяспечыць належны навукова-даследчы і афармленчы ўзровень дыпломнай работы, добры настрой яе аўтару, навуковаму кіраўніку, рэцэнзенту і Дзяржаўнай камісіі.

Плённай творчасці і ўзнёслай абароны зычаць вам аўтар дапаможніка і шаноўныя рэцэнзенты – прафесар Н. Ц. Фральцова і прафесар А. Г. Слука, якім я ўдзячна за слушныя парады.

# Частка I

# ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА ЯК НАВУКОВЫ ЖАНР

## ТЫПАЛАГІЧНА-ВІДАВЫЯ ПРЫМЕТЫ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ І НАВУКОВЫХ ВЫДАННЯЎ

Не прэтэндуючы на месца ў сістэме навуковых камунікацый, дыпломная работа ў сваім рукапісным варыянце мае тыя ж тыпалагічныя і відавыя прыметы, што і кніжнае навуковае выданне. Пад навуковым выданнем прынята лічыць выданне, якое ўтрымлівае вынікі тэарэтычных і/альбо эксперыментальных даследаванняў.

*Тыпалагічнымі прыметамі* навуковага выдання, як і любога іншага, прынята лічыць: *мэтавае прызначэнне, характар інфармацыі і чытацкі адрас выдання.* Гэта тыя тры ўласцівыя для кожнага *тыпу выдання* (кніжнага, часопіснага, газетнага, нотнага, буклетнага і інш.) прыметы, паводле якіх праводзіцца відавая класіфікацыя выданняў. Вылучаюць наступныя *віды выданняў*: палітычныя, вучэбныя, навуковыя, навукова-папулярныя, дзіцячыя і інш. У кожнага з відаў, як і ў кожнага твора пэўнага віду выдання, свае мэтавае прызначэнне, характар інфармацыі і чытацкі адрас. Калі, напрыклад, мэтавае прызначэнне навуковых выданняў у цэлым заключаецца ў адлюстраванні вынікаў пазнавальнай дзейнасці праз сістэму навуковых камунікацый (фарміраванне навуковага светапогляду; замацаванне навуковых прыярытэтаў; фіксаванне іх у хранатопным вымярэнні (хранатоп – ст.-грэч. «часпрастора») і інш.), дык мэтавае прызначэнне асобнага навуковага твора, скажам, у ***жанры*** манаграфіі, адпаведна канкрэтызаванае. Як канкрэтызаваныя і характар інфармацыі, і чытацкі адрас. **Дыпломная работа** ў сістэме гэтых каардынат выглядае наступным чынам. Яна ўспрымаецца як атэстацыйны дакумент, першапачатковая ***мэта*** якога – *адлюстраваць даследчыя здольнасці аўтара-выпускніка, узровень яго прафесійнага досведу ўвогуле і датычна прадмета даследавання ў прыватнасці.*

***Характар інфармацыі*** *ў дыпломнай рабоце абумоўлены задачамі навуковага даследавання і вызначаецца профільным кірункам адукацыі выпускніка.* ***Чытацкі адрас*** дыпломнага твора сціплы – навуковы кіраўнік, рэцэнзент ды члены камісіі агартаюць у працэсе абароны.

Больш пашыраны «слухацкі» адрас – тыя ж члены камісіі і прысутныя на абароне выкладчыкі, калегі, сябры.

Зусім не выпадкова, што рукапіснае навуковае даследаванне ў выглядзе дыпломнай работы набліжана да кніжных навуковых выданняў, нават да такога навуковага «аўтарытэту», як манаграфія. *Дыпломнае даследаванне*, калі ўлічыць характар яго інфармацыі, здольнае перакваліфікавацца ў кніжны навуковы жанр кшталту артыкула, манаграфіі і заняць законнае месца ў сістэме навуковых камунікацый. Больш за тое, Дзяржаўная атэстацыйная камісія мае права на «вердыкт»: «дыпломная работа рэкамендуецца да друку». У друку гэта будзе ўжо адпаведны жанр твора, з адпаведным чытацкім адрасам. Хаця дыпломная работа мае блізкае сваяцтва з навуковымі жанрамі, але жанравага статусу пакуль не мае, нягледзячы на тое, што неабходнай умовай падрыхтоўкі навуковага твора, сцвярджаюць спецыялісты, «з'яўляецца веданне і ўлік жанравай спецыфікі». Паспрабуем адшукаць, а дакладней, вызначыць, гэтую спецыфіку *метадам супастаўлення* дыпломнай работы з навуковымі творамі пэўных жанраў.

## СТРУКТУРНА-ЗМЕСТАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ І ТВОРАЎ НАВУКОВЫХ ЖАНРАЎ

Дыпломная работа – гэта, у першую чаргу, *правільна арганізаваная інфармацыйная сістэма*. Работа мае тую ж структуру, што і навуковае кніжнае выданне, і тыя ж патрабаванні да зместавага напаўнення кожнага складніка гэтай структуры. У пацвярджэнне структурна-зместавай ідэнтычнасці дыпломнага даследавання з навуковымі творамі, да прыкладу ў жанры манаграфіі, выкарыстаем унікальны падручнік «Редакторская подготовка изданий» (2004) унікальнай школы – Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта друку (расійскі МГУП) [гл.: 90][1]. У главе «Научные издания» ў параграфе 2.4 «Работа над научным произведением»

[1] Крыніцы, на якія зроблены бібліяграфічныя спасылкі ў тэксце нашай кнігі, месцяцца ў затэкставым бібліяграфічным спісе ў канцы выдання (гл.: «Бібліяграфічны спіс літаратуры па журналісцкай тэматыцы (для першапачатковага выкарыстання аўтарам дыпломнай работы)», с. 76–87). У бібліяграфічнай спасылцы ў квадратных дужках паказаны нумар крыніцы і нумары старонак тэксту, узятага з гэтай крыніцы.

з першых радкоў чытаем: «В научном произведении как элементе научной коммуникации должны находить наиболее полное отражение *предмет*, *цель* и *задачи* научного исследования (познания), его *характер, метод* и *результат*» (тут і далей вылучана намі. – *М. К.*) [90, с. 47–48]. (Цытаты і надалей будуць падавацца на мове крыніцы.) У названым падручніку ўсе прадпісанні па падрыхтоўцы навуковага выдання – глыбокія, усебаковыя, шматаспектавыя – адрасуюцца *высокапрафесійнаму* выдавецкаму рэдактару, які пачынае працу па стварэнні кніжнага навуковага выдання, з фарміравання *канцэпцыі*. «Работа редактора над концепцией научного издания направлена на то, чтобы сформулировать *целостную информационную систему*, состоящую из органически связанных между собой литературного произведения и аппарата издания. При этом в содержании и структуре издания должны быть отражены все составляющие научного исследования» [Тамсама, с. 47]. Працытаваны тэкст зусім не азначае, што ў рукапісным навуковым творы, які рыхтуецца да друку, не праглядаецца аўтарская канцэпцыя. Рэдактарская ж канцэпцыя скіравана на пераўтварэнне рукапісу ў кніжнае навуковае выданне, якое мае быць цэласнай інфармацыйнай сістэмай, куды арганічна ўвойдуць усе яе складнікі: тэкставыя, пазатэкставыя, усе рубрыкі, пошукавыя элементы (змест, паказальнікі) і інш. Гэткай жа *арганізаванай інфармацыйнай сістэмай павінна быць і дыпломная работа*.

«Навошта нам школа рэдактара для напісання дыпломнай работы?» – спытаеце вы. Рэч у тым, што з кожнай прачытанай старонкай нашага метадычнага твора вы будзеце пераконвацца не толькі ў *жанравай ідэнтычнасці дыпломнай работы і*, скажам, *манаграфіі*, але і ў ідэнтычнасці рэдактарскіх абавязкаў па забеспячэнні належнага ўзроўню навуковага выдання з абавязкамі аўтара дыпломнай работы і навуковага кіраўніка, які ў часе свайго кіравання выконвае функцыі і навуковага, і літаратурнага рэдактара. І нават карэктара! Але аднаго толькі пераканання, вядома ж, недастаткова. У працяг нашай размовы пра структурна-зместавую ідэнтычнасць дыпломнай работы і навуковых выданняў прывядзём шэраг тэарэтычных палажэнняў датычна жанравай рэгламентацыі навуковых выданняў і параўнаем з імі тэарэтычныя падыходы да дыпломнага даследавання. Да прыкладу, аўтары названага падручніка вылучаюць у навуковых творах, такіх як манаграфія, артыкул, даклад, тры часткі: *уводную*, *асноўную* і *заключную*. Кожная з іх мае свае прызначэнне, пабудову і зместавае напаўненне.

# УВОДНАЯ ЧАСТКА. УЗОР НАПІСАННЯ ЎВОДЗІНАЎ

Ва ***ўводнай частцы***, як адзначаецца ў выкарыстаным намі падручніку, звычайна абгрунтоўваецца *актуальнасць тэмы* і *мэтазгоднасць* яе распрацоўкі, фарміруецца *мэта* даследавання; могуць быць абазначаны *ўмовы*, у якіх праведзена даследаванне, выкладзены *метад*; даецца кароткая характарыстыка і ацэнка *вынікаў* (навізна, тэарэтычная і практычная вартасці); паказваецца ступень апрабацыі і рэалізацыі вынікаў; адзначаюцца асаблівасці даследавання, выкладу матэрыялу. «*Актуальность темы определяется ее научным и народнохозяйственным значением, а также соответствием современному уровню и перспективам развития науки и производства*» [90, с. 49]. *Задача* ўводнай часткі – падрыхтаваць чытача да ўспрымання твора ў цэлым, зарыентаваць яго ў матэрыяле [Тамсама, с. 52–53].

Зазначым, што для аўтара дыпломнай работы ў гэтых выкладах нічога лішняга няма. Застаецца толькі дадаць: ва «Уводзінах» пасля абгрунтавання актуальнасці тэмы адразу апісваюцца *аб'ект* і *прадмет* даследавання, які вылучаецца са зместавай парадыгмы аб'екта даследавання і з якога, у сваю чаргу, вылучаецца як сегмент *тэма* даследавання. У дыпломнай рабоце па журналістыцы *аб'ект* даследавання ў пэўным сэнсе велічыня пастаянная: масавая камунікацыя, масавая інфармацыя і сістэма сродкаў іх рэалізацыі (друкаваныя СМІ, аўдыявізуальныя, інтэрнэт-СМІ). Не пашкодзіць, калі ва ўводзінах будуць сфармуляваны *палажэнні*, якія выносяцца на абарону (4-5 палажэнняў).

Не аддаляючыся ад выкладзеных патрабаванняў да ўводнай часткі навуковых твораў, прывядзём узор тэксту ўводзінаў з даследчай дыпломнай работы па спецыяльнасці «Журналістыка (друкаваныя СМІ)» на тэму «Информационные агентства в системе СМИ: специфика творчества». (Найменні іншых спецыяльнасцей: «Журналістыка (аўдыявізуальная)»; «Журналістыка міжнародная»; «Літаратурная работа (рэдагаванне)»; «Інфармацыя і камунікацыя (тэхналогіі камунікацыі)».) Для арыентавання ў характары інфармацыі названай дыпломнай работы перад уводзінамі падаём тытульны ліст, змест і спіс скарачэнняў (заадно і ў якасці ўзору іх афармленчых стандартаў).

Перадусім зазначым, што дыпломныя работы выпускніка Інстытута журналістыкі БДУ кваліфікуюцца як *даследчыя* і як *творчыя*. Інфармацыя пра творчую дыпломную работу выкладзена ў **Частцы II** нашага дапаможніка ў параграфе «Творчая дыпломная работа» (с. 31–32). Дыпломная работа, якая не падпадае пад катэгорыю творчай, лічыцца даследчай. Яе даследчы характар раскрываецца ўжо

ва ўводзінах. Дыпломная работа, фрагменты якой мы зараз падаём, адносіцца да катэгорыі даследчых па спецыяльнасці «Журналістыка (друкаваныя СМІ)».

* * *

***Тытульны ліст*** займае асобную старонку, якая не нумаруецца. Інфармацыя на тытульным лісце размяшчаецца з улікам тэхнічнага стандарту старонкі: верхняе і ніжняе поле – 2 см; левае – 3 см; правае – 1 см:

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ**
**ИНСТИТУТ ЖУРНАЛИСТИКИ**
**Факультет журналистики**

**Кафедра теории и методологии журналистики**

**Информационные агентства в системе СМИ: специфика творчества**

Дипломная работа
студентки 5-го курса
(специальность «Журналистика
(печатные СМИ)»;
дневная форма обучения)
КАЛИНОВСКОЙ Ирины Валентиновны

Научный руководитель –
канд. филол. наук доцент
КАРПОВИЧ Мария Петровна

Рецензент –
доктор полит. наук профессор
БАРАНОВА Елена Владимировна

Минск
2008

## ОГЛАВЛЕНИЕ

**Список сокращений** ... 3
**Введение** ... 4
**Глава 1 Телеграфная информационная связь – величайшее достижение цивилизации (исторический экскурс)** ... 7
1.1 Появление мировых информационных агентств ... 7
1.2 Появление и развитие российских информагентств ... 12
1.3 История информационной службы Беларуси ... 14
**Глава 2 Информационные агентства как субъект современного медийного пространства** ... 25
2.1 Мировые информационные агентства в современной медиасистеме ... 25
2.2 Место и роль национальных информационных агентств в современном медиапространстве ... 32
2.3 Феномен сетевых информационных агентств ... 40
**Глава 3 Специфика деятельности информационных агентств** ... 45
3.1 Жанровая палитра материалов информационных агентств в теоретическом освещении ... 45
3.2 Содержательные и композиционные особенности текстов информационных агентств ... 56
**Заключение** ... 63
**Список использованной литературы** ... 65

# СПИСОК СОКРАЩЕНИЙ

**АП** – Ассошиэйтед Пресс;

**АПН –** Агентство печати «Новости»;

**АСИ** – Агентство социальной информации;

**АФН** – Агентство финансовых новостей;

**АЭН** – Агентство экономических новостей;

**БелаПАН** – Беларускае прыватнае агенцтва навін;

**БелКТА** – Белорусское коммерческое торговое агентство;

**БелТА** – Белорусское телеграфное агентство;

**БЕЛОТРОСТА** – Белорусское отделение РОСТА;

**БНР** – Белорусская Народная Республика;

**БПБ** – Белорусское пресс-бюро;

**ДПА** – Дойче Прессе Агентур;

**ИА** – Информационное агентство;

**ИТАР-ТАСС** – Информационное телеграфное агентство России;

**КТА, КомТА** – Коммерческое телеграфное агентство;

**МТК** – Международный телеграфный код;

**ПТА** – Петроградское телеграфное агентство;

**РАСИ** – Российское агентство социально-экономической информации;

**РОСТА** – Российское телеграфное агентство;

**РЭФИА** – Российское экологическое федеральное информационное агентство;

**СоюзКТА** – Союзное коммерческое телеграфное агентство;

**СПТА** – Санкт-Петербургское телеграфное агентство;

**СМИ** – Средство(-а) массовой информации;

**ТАСС** – Телеграфное агентство Советского Союза;

**VDU** – Video Display Unit;

**WAP** – Wireless Application Protocol.

# ВВЕДЕНИЕ

Термин *агентство* (лат. agentis – действующий) стал широко использоваться для обозначения организаций, занимающихся какой бы то ни было посреднической деятельностью. *Информационное агентство* – организация, осуществляющая сбор и оперативное распространение информации.

Информационные агентства – первичные структуры в системе СМИ, которые занимаются сбором и распространением информации. Роль информационных агентств огромна как в историческом развитии журналистики, так и в современном. Они традиционно считались главным субъектом медиапроцессов, наполняя информационные потоки, будучи нервом и двигателем массмедиа в информационном пространстве. Агентства были в ряду первых, кто осознал полезность и перспективность таких изобретений как электричество, телеграф, компьютер, интернет. С момента появления агентств (середина XIX века) и до наших дней информационные агентства лидируют в сфере СМИ по использованию новейших информационных и коммуникационных технологий.

В 1870 году, заключив договор о разделе сфер влияния, агентства впервые создали прецедент информационной монополии. Прошло более века, но и сегодня новостные выпуски тысяч газет, телеканалов и радиопередач во многом определяются подборкой информации, которую им предоставляют мировые и национальные информационные агентства. Продавая новости прессе и другим клиентам, информационные агентства первыми начали процесс коммерциализации журналистики. Во время обеих мировых войн агентства стали важнейшими инструментами войн информационных. Информагентства внесли большой вклад в глобализацию информационных процессов, связав телеграфной и спутниковой связью страны и континенты, что в конечном итоге ведет к становлению нового типа общества – информационного.

Информационные агентства сегодня полностью инкорпорировались в систему массмедиа и могут рассматриваться как один из видов средств массовой информации, так как изменения, произошедшие в последние десятилетия в структуре и деятельности агентств, позволяют им быть не только посредниками, а и работать напрямую с клиентами.

Несмотря на масштабность сети информационных агентств и их роль в современном медиамире, научных исследований по вопросам их деятельности на сегодня очень немного. Среди зарубежных авторов, исследующих эту сферу, следует назвать О. Бойда-Бэрретта, Т. Рантаген, К. Паттерсона, Дж. Фенби, Г. Хене.

В российской науке следует назвать работы таких авторов, как К. А. Войцехович [7], А. И. Егоров [12], Ю. А. Погорелый [28], Н. В. Саляхова [30], В. И. Сапунов [31], О. Р. Лащук [22]. (Как правило, названные работы – это диссертационные исследования на соискание ученой степени кандидата или доктора наук.)

Необходимо отметить, что все вышеперечисленные работы были написаны в период с 2001 по 2007 год, что свидетельствует о проявлении научного интереса к теме информационных агентств именно в последнее время.

В белорусском научном арсенале по теме информационных агентств имеется монография А. М. Михальченко «I верш, i эпас тэлеграфным радком...» (1993). Таким образом, можно утверждать, что в Беларуси сегодня нет научных исследований, системно раскрывающих феномен информационных агентств и освещающих их роль, место в современном медийном пространстве.

В свете вышеизложенного *актуальность* темы дипломной работы сомнения не вызывает.

*Объектом* данного дипломного исследования являются информационные агентства как часть современной системы СМИ. *Предмет* исследования – специфика организационной и творческой работы информационных агентств (на примере ведущих мировых и национальных агентств).

*Цель работы* – отразить процесс формирования и развития телеграфных информационных агентств и определить их место в системе СМИ. Для достижения цели поставлены следующие *задачи:*

- изучить исторические предпосылки и факторы, обусловившие появление и развитие информационных агентств;
- определить роль информагентств как субъекта в современном медийном пространстве;
- изучить специфику творческой деятельности информагентств, в том числе Белорусского телеграфного агентства.

*Новизна исследования* заключается в том, что впервые в отечественной науке рассматриваются информационные агентства в системе СМИ в таком широком контексте. И рассматриваются не только как посредник между источником новости и другими СМИ, а как отдельное средство массовой информации. Кроме того, впервые анализируются материалы Белорусского телеграфного агентства в сопоставлении с материалами других (в частности, российских) информагентств.

В дипломном исследовании использованы *методы* описательный, аналитический, сопоставительный.

На защиту выносятся следующие *положения*:

1. Информационные агентства – величайшее достижение цивилизации.

2. Информационные агентства – не только посредники между источником новости и СМИ, но и отдельное средство массовой информации.

3. Сетевые информагентства – особый прототип «массмедийного будущего».

4. БелТА – наиболее активное и опытное агентство на территории Беларуси.

*Практическая значимость работы.* Материалы дипломного исследования могут быть использованы в практике работы белорусских информационных агентств, а также в учебном процессе на факультете журналистики. (Цяпер у Інстытуце журналістыкі БДУ. – *М. К.*)

* * *

(Больш грунтоўнымі з'яўляюцца *палажэнні*, вынесеныя на абарону ў магістарскай дысертацыі на тэму «Специфика творческой деятельности информационных агентств в системе СМИ (по материалам БелТА и РИА "Новости")», напісанай гэтым жа аўтарам.

1. В разнообразии медиаисточников информационные агентства по-прежнему являются доминирующими субъектами наполнения информационных потоков. Мировые агентства новостей по факту формируют международную повестку дня, оставаясь, таким образом, и явлением, и инструментом глобализации.

2. Исторически обусловленное разделение агентств на мировые и национальные сохранилось по сей день. Сегодня национальные агентства формируют имидж своего государства на мировом пространстве, определяют повестку дня у себя дома. По такому пути пошли агентства БелТА (Беларусь) и РИА «Новости» (Россия).

3. Формирование новых типов спроса на информацию повлекло за собой изменение структуры информационных услуг крупных агентств, в т. ч. национальных. Информационный продукт агентств представляет собой тип «новых медиа», ключевой характеристикой которых является «пакетное» предоставление текстовой, графической и звуковой информации в цифровом стандарте.

4. Белорусское агентство БелТА, в отличие от РИА «Новости», до сих пор является преимущественно текстовым агентством и основной своей задачей видит посреднические услуги для других

СМИ. Такая позиция может привести к значительному моральному и технологическому отставанию сектора информационных агентств в Республике Беларусь.

5. Информационное агентство можно рассматривать как самостоятельное средство массовой информации.)

Уводзіны як элемент дыпломнай работы падрыхтоўваюць чытача да рацыянальнага і больш глыбокага асэнсавання навуковай інфармацыі даследавання ў цэлым.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА. УЗОРЫ АФАРМЛЕННЯ ГЛАЎ (ФРАГМЕНТЫ)

***Асноўная частка*** мае на мэце паказаць *працэс даследавання праблемы і распрацоўкі тэмы*, шляхі атрымання вынікаў і самі *вынікі*. Тут прыводзяцца пастаноўкі задач, іх вырашэнні, неабходныя апісанні і тлумачэнні, доказы і абгрунтаванні. *«Основная часть служит формированию нового научного знания на основе анализа и синтеза информации»* [90, с. 53].

Асноўная частка дыпломнай работы як навуковага твора, гаворачы на мове метадалогіі сучаснага рэдагавання, ёсць не што іншае, як *распрацоўка тэмы*, вядомая кожнаму дыпломніку з навучальнага працэсу ў Інстытуце журналістыкі БДУ [гл.: 53, с. 29–31].

У сувязі з распрацоўкай тэмы рэдактару навуковай літаратуры прадпісана: *«Оценить научность, достоверность, обоснованность фактического материала, его репрезентативность, полноту; структуру произведения, логику его построения, языково-стилистические качества, реализацию замысла (цели исследования), чтобы составить достаточно полное представление о целесообразности работы над подготовкой издания»* [90, с. 50]. Па гэтай жа мадэлі ацэньваецца асноўная частка дыпломнай работы навуковым кіраўніком і фармулююцца рэкамендацыі для дыпломніка па ўдасканаленні тэксту.

«На работу редактора над научным произведением и подготовку издания налагает отпечаток и *взаимодействие наук*, которое приобретает всё более актуальный характер, – адзначаюць аўтары падручніка. – *Усиление взаимосвязи общественных, естественных и технических наук, что рассматривается в качестве ведущей тенденции современной науки*, ставит задачу комплексного подхода к редакторскому анализу и оценке содержания научного произведения» [Тамсама].

У нашай «дыпломнай» сітуацыі ўсе пералічаныя рэдакцыйныя клопаты выпадаюць на долю самога дыпломніка і яго навуковага кіраўніка.

Кожны наш выпускнік ведае, што аснову твора складае *фактычны матэрыял*. Тым болей навуковага твора – дыпломнага даследавання, дзе *сапраўдная навука нічога не павінна прымаць на павер, яна існуе і развіваецца на глебе сцверджаных фактаў*.

Пад *фактам* у навуцы трэба разумець аб'ектыўна існуючую рэч, уласцівасць, з'яву, падзею. Пакуль з'ява ці падзея не высветлілася і непазнаная, яе нельга лічыць фактам навукі. Патлумачыць факт – гэта значыць паставіць яго ў аб'ектыўна існуючую прычынную, заканамерную ўзаемасувязь з іншымі фактамі, з усёй сукупнасцю вядомых фактаў. Асобна ўзятыя выпадковыя факты могуць служыць толькі прыватным прыкладам, а не доказам ісціны. На падставе фактаў, правільнага іх тлумачэння нараджаецца навуковая тэорыя, якая сама з'яўляецца **фактам**. *Факты ў навуковым творы адлюстроўваюць усю разнастайнасць інфармацыі, як зыходнай, так і атрыманай у працэсе даследавання. Гэта тое, што складае інфармацыйнае апірышча даследавання і новы навуковы досвед.* Сюды адносяцца даныя назіранняў, гіпотэзы, эксперыментальныя даныя, прыёмы доказнасці, вядомыя і новыя тэорыі, аўтарскія метады. Да фактычнага матэрыялу адносяцца таксама статыстычныя звесткі, імёны, найменні, даты, формулы, цытаты. *Усе факты ў навуковым даследаванні павінны разглядацца ў сувязі з тэмай даследавання, прадметам даследавання і павінны быць абумоўлены мэтай і задачамі даследавання* [гл.: 90, с. 51–52].

Аўтары знаёмага ўжо нам падручніка «Редакторская подготовка изданий» – *«ведущие профессора и исследователи книжного дела из Московского государственного университета печати»* – небеспадстаўна звяртаюць увагу на *метады выкладу* навуковай інфармацыі (не блытаць з метадамі даследавання), на мэтазгоднасць іх выкарыстання (зазначаны падручнік, між іншым, адрасаваны і для *журналістаў*). Маюцца на ўвазе наступныя метады выкладу: індуктыўны метад разважання (ад прыватнага да агульнага); дэдуктыўны метад (ад агульнага да прыватнага); лагічны метад (выклад будуецца на паказе прычын і высноў, падзеле матэрыялу на сэнсавыя фрагменты – метад лічыцца высокаінфарматыўным); гістарычны метад выкладу (дынамічны, адлюстроўвае працэс развіцця падзей, з'яў у іх паслядоўнасці, храналогіі); метад спіралі (заснаваны на паступовым развіцці думкі

шляхам паўтарэння яе на кожным новым, больш высокім узроўні абагульнення). Індуктыўны метад разважання мае высокую ступень доказнасці. Дэдуктыўны метад лічыцца асноўным пры фарміраванні і абгрунтаванні тэорый. *Метады выкладу вызначаюцца прыродай прадмета даследавання, характарам інфармацыі* [90, с. 54–55].

* * *

Асноўную частку дыпломнай работы складаюць яе главы і заключэнне. Прывядзём узор напісання ***высноў*** пасля кожнай главы і пазначым колькасць старонак глаў для адлюстравання іх суразмернасці.

**Глава 1 Телеграфная информационная связь – величайшее достижение цивилизации (исторический экскурс)** ............ (7–24)

**Выводы.** Зарождение и развитие информационных агентств исторически тесно связаны с новинками прогресса и использованием последних технических разработок в области связи. Телеграфные агентства в современном понимании – следствие изобретения электрической телеграфной связи.

С появлением крупных европейских национальных рынков возросла *необходимость в быстрой и точной информации, что обусловило традиционные критерии деятельности информагентств*.

Благодаря разделению мирового новостного рынка появились мировые и национальные информационные агентства. Мировые информационные агентства внесли значительный вклад и в процесс глобализации современного мира, поделив между собой и унифицировав информационные потоки.

В период становления и развития информационных агентств (конец XIX – начало XX вв.) формировался их особый, *стандартизированный* стиль работы, определялись направления и масштабы деятельности.

Исходя из анализа исторического развития информационных служб можно сделать вывод, что они с самого начала тесно сотрудничали с периодическими изданиями (газетами, журналами), а потому изначально заняли определённое место в системе СМИ. Ограничивать их роль только рамками посреднической деятельности было бы в корне неверно – агентства с самого начала своего существования определяют информационную повестку дня в мировом и национальном масштабе. Российские и белорусские информационные службы развивались в контексте мировых служб

и в тесной связи друг с другом. В период становления и развития отделений российских информационных служб происходило зарождение и формирование белорусской новостной журналистики, которая во многом опиралась на опыт российских коллег.

**Глава 2 Информационные агентства как субъект современного медийного пространства** ............................................(25–44)

**Выводы.** Современные информационные агентства включены сразу в несколько контекстов медийной реальности. Если мировые агентства усиливают процессы глобализации и способствуют унифицированию, стандартизации информации и мышления, то национальные призваны сохранить и приумножить своеобразие собственной информационной модели, оставаясь в то же время в русле мировых тенденций. Деятельность национальных информационных агентств является одним из способов проявления идентичности государства, формирования его национального имиджа.

В деятельности российских и белорусских национальных информационных агентств есть много общего. Они прошли единый процесс формирования и исторического развития, функционировали в системе советских СМИ. В обеих странах наблюдается процесс специализации информагентств и выход к конечному пользователю посредством интернета.

**Глава 3 Специфика деятельности информационных агентств**........................................................................(45–62)

**Выводы.** Творческая специфика деятельности информационных агентств ярко предстаёт при изучении жанровой палитры материалов, их тематической составляющей и особенностей композиции. Информационные сообщения, как правило, сохраняют общий стандарт – содержательный и композиционный. При наличии незначительных отступлений, допускаемых в тех или иных агентствах. К примеру, в новостных материалах агентства БелТА отсутствует очень важный структурный элемент – слаглайн, который предваряет содержание новости, что очень важно для читателя.

Творческую специфику деятельности информационных агентств целиком и полностью определяют характер самой задачи, стоящей перед агентствами, а также критерии их информационной продукции. Так, оперативностью информационных сообщений обусловлен объём содержания материала, его чёткая структура. От того насколько строго агентства будут следовать этим критериям, зависят их положение на информационном рынке, интерес и лояльность получателя информации.

# ЗАКЛЮЧНАЯ ЧАСТКА. УЗОР НАПІСАННЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ

«*В **заключительной части** в соответствии с логикой исследования подводится итог работы, формулируются выводы, приводятся рекомендации, указываются возможные направления последующих научных исследований, чем подчёркивается непрерывность науки, её динамичность и постоянство развития*» [90, с. 53]. Прыведзеная цытата як мага паўней раскрывае сутнасць заключнай часткі навуковага даследавання, у нашым выпадку «Заключэння» як абавязковай структурнай часткі дыпломнай работы. Адзначу, што гэты невялічкі кавалак дыпломнага даследавання (прыкладна 3 старонкі) заўжды ёсць галаўны боль для яго аўтара. У асноўным па аб'ектыўнай прычыне: не стае як даследчага вопыту, так і практыкі стварэння тэкстаў навуковых жанраў. Тым не менш, пазнаючы сучасную метадалогію стварэння навуковага тэксту, асновы падрыхтоўкі да выпуску ў свет навуковых выданняў, мы пераконваемся, што аўтар дыпломнай работы абавязаны забяспечыць тую ж гармонію зместу і формы, той жа ясны выклад матэрыялу, унутраную логіку сэнсавага развіцця тэксту ў цэлым, яго структуру, што і аўтар і рэдактар манаграфіі – «*наиболее авторитетного жанра научных произведений*». «*Структура должна обеспечивать быстрое, точное, доходчивое доведение содержания до читателя*» [Тамсама]. У нашым выпадку – да чытача дыпломнай работы.

* * *

Прыводзім узор заключэння з той жа дыпломнай работы, што і ўсе папярэднія ўзоры.

## ЗАКЛЮЧЕНИЕ

Информационные агентства – особый субъект в многообразном пространстве современных средств массовой информации. Информагентства по-прежнему играют решающую роль в содержательном наполнении СМИ.

1. Появление информационных агентств было обусловлено закономерностями социально-экономического развития общества, его научно-техническим потенциалом. Изобретение телеграфа, с одной стороны, и развитие класса буржуазии – с другой, стали

главными факторами зарождения и становления новых субъектов информационного пространства – телеграфных агентств. С момента их появления мировое медиаполе изменилось раз и навсегда. Появились компании, которые по сей день продолжают определять новостную тематику ведущих газет, телеканалов, радиостанций, влиять на мировое общественное мнение и расставлять информационные поводы по степени важности.

2. Продолжая выполнять свою традиционную роль поставщика новостной информации для других СМИ, информационные агентства сегодня сами выходят к конечному потребителю и находят новые рынки в виде финансовых компаний и бирж.

3. Функции ИА за последние десятилетия значительно расширились. Сегодня основная статья их дохода – консалтинговые и производственные услуги на рынке финансов. Сами агентства существуют в условиях жесткой конкуренции, о чём свидетельствуют изменения в картине «сильнейших».

4. Появление и развитие всемирной сети интернет не только не пошатнуло положение информационных агентств, но и позволило им развить новое направление деятельности. В перспективе, по мнению аналитиков, новостная журналистика в значительной степени переместится в интернет, на сайты информагентств.

5. Стилевой стандарт сформировался с момента появления информагентств и держится до сих пор. Новости ИА подчинены особым правилам написания и построения, что позволяет выделить их как своеобразный продукт журналистского творчества, а информагентства – как отдельный и весьма важный элемент системы СМИ.

6. На данный момент наиболее опытным и самым крупным агентством на территории Беларуси является БелТА. Одновременно сохраняются черты монополизации медиапространства этим агентством, что не способствует развитию здоровой конкуренции с другими ИА, появление которых связано с распадом Советского Союза.

7. Ключевые звенья в характеристике деятельности информационных агентств следующие:

- современные телеграфные агентства – плод научно-технического прогресса (изобретение телеграфной связи);
- информагентства разделились на мировые и национальные с соответствующим разделом «сфер влияния»;
- агентства активно используют передовые информационные технологии, спутниковую связь и др.;

- информационные агентства сегодня обслуживают бизнес; объём услуг для средств массовой информации по ряду причин снижается;
- агентства начали выходить напрямую к своему адресату (в т. ч. и с помощью сети интернет);
- для информационных агентств характерна особая жанровая палитра, специфическая содержательная и композиционная структура текста, свой терминологический аппарат и редакторский код;
- современный продукт информагентств – прототип средств массовой информации будущего.

Учитывая постепенный переход человечества к информационному обществу, можно прогнозировать, что информагентства будут усиливать свои позиции и укрепляться на рынке с помощью новейших коммуникационных технологий. Вместе с этим будет расти исследовательский интерес к деятельности информационных агентств как к важному субъекту информационного пространства.

* * *

З а ў в а г а. Нумараваць абзацы ў заключэнні патрэбы няма.

Такім чынам, у **Частцы І** мы ні ў якім разе не ідэнтыфікуем навукова-камунікацыйную значнасць манаграфіі і дыпломнай работы. Мы супаставілі жанравыя асаблівасці гэтых двух твораў: характар інфармацыі, структуру, рубрыкацыю, логіку падзелу на главы, раздзелы і інш. – інакш кажучы, структурна-зместавую арганізацыю іх інфармацыйнай сістэмы, з мэтай абгрунтаваць прыналежнасць дыпломнай работы да навуковых жанраў; надаць дыпломнай рабоце *статус навуковага жанру*, што, на маю думку, азначае ***падняць аўтарытэт дыпломнай работы як навуковага твора і як формы прафесійнай атэстацыі выпускніка.***

# Частка II | НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ СПЕЦЫФІКА ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ ПА ЖУРНАЛІСТЫЦЫ

У адрозненне ад жанравых прымет, агульных для даследчай дыпломнай работы па любой спецыяльнасці, навукова-даследчы кірунак дыпломнай работы мае спецыфіку, абумоўленую зместам прафесійнай адукацыі, закладзеным у адукацыйных стандартах ВНУ.

## ПРАДМЕТНАЯ ГАЛІНА ДАСЛЕДАВАННЯ

Прадметная галіна («область») даследаванняў у сферы масавай камунікацыі ўяўляе шырокую тэматычную парадыгму, якая знаходзіць сваё адлюстраванне ў тэматыцы дыпломных работ. Гэта, у аснове сваёй, такія галіновыя накірункі, як масавая камунікацыя і грамадства; СМІ і ўлада; СМІ і эканоміка; СМІ і культура; сацыяльная функцыя СМІ; сацыялогія масавай камунікацыі; СМІ ў мадыфікацыі дзяржаўных інстытутаў (палітычных, заканадаўчых, выканаўчых) і інш.

Прадметнае поле навукова-даследчай працы ў журналістыцы неабсяжнае. Новыя канцэпцыі ўмацавання нацыянальнай дзяржаўнасці вымагаюць ад сродкаў масавай інфармацыі новых канцэптуальных накірункаў і ў практычнай, і ў даследчай сферах дзейнасці. Дастаткова пазнаёміцца з такім дакументам, як новая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Беларусі, сфармуляваная ў лістападзе 2010 года, каб раскрыць тэматычныя перспектывы для даследавання беларускай масмедыйнай сферы. Штотыднёвік «Аргументы и факты в Белоруссии» параўноўвае новую Канцэпцыю з Канцэпцыяй 2001 года на прадмет таго, якія пагрозы ліквідаваныя і што, на думку ўрада, пагражае нам сёння. Як высветлілася, новых праблем нямала, пераважна ўнутраных: недастатковы ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці; бюракратызацыя дзяржаўнага ўпраўлення; адставанне ад сумежных («сопредельных») краін па тэмпах і якасці эканамічнага росту; высокія адміністрацыйныя

бар’еры для развіцця бізнесу; неспрыяльныя ўмовы для прыцягнення замежных інвестыцый і крэдытаў; рост неплацяжоў у эканоміцы ў выніку дэфіцыту ўласных абаротных сродкаў і высокай удзельнай вагі стратных прадпрыемстваў; страта стабільнасці нацыянальнай грашовай адзінкі; няздольнасць вяртаць і абслугоўваць вонкавы і ўнутраны доўг; навукаёмістасць ВУП ніжэйшая за крытычны ўзровень, неабходны для ўзнаўлення навукова-тэхнічнага патэнцыялу; у сацыяльнай сферы пагражае рэзкае сацыяльнае расслаенне; недастатковая матывацыя да эфектыўнай працы; неапраўданыя дыспрапорцыі ў сферы аплаты працы і пенсійнага забеспячэння; нізкая ўнутраная мабільнасць насельніцтва; адставанне якасці адукацыі па шэрагу перспектыўных накірункаў ад узроўню лепшых сусветных адукацыйных цэнтраў, недастатковая колькасць сучасных высокакваліфікаваных спецыялістаў сусветнага ўзроўню.

Урад адзначыў, цытуе газета, «паслабленне ў грамадстве пачуцця патрыятызму, гатоўнасці грамадзян да ўзброенай абароны незалежнасці, суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу». Сярод вонкавых пагроз названа развіццё транзітных калідораў, сістэм транспарціроўкі энергарэсурсаў, альтэрнатыўных беларускім, дыскрымінацыя Беларусі ў рамках міжнародных суполак і ўтварэнняў; абмежаванне доступу беларускіх даследчыкаў і суб’ектаў гаспадарання да вынікаў даследаванняў сусветнага ўзроўню. Урад упершыню заклапочаны «паслабленнем нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары». «Такі крытычны і сумленны аналіз болевых кропак можа толькі радаваць», – рэзюмуе газета «АиФ». У новую Канцэпцыю, на жаль, перайшлі шматлікія пагрозы з Канцэпцыі 2001 года. «Яшчэ 10 гадоў таму ўрад лічыў, – зазначае газета, – што нам пагражае рост зношанасці вытворчых магутнасцей, выкарыстанне недасканалых тэхналогій з павышанай энергаёмістасцю, нізкай якасцю прадукцыі і высокімі выдаткамі (“издержками”)». Пагрозай лічыўся і рост колькасці людзей, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў, алкагалізму, наркаманіі. Гэтыя праблемы так і засталіся нявырашанымі, а некаторыя нават паглыбіліся, паведамляе газета (Болевые точки. Десять лет спустя // АиФ. 2011. 12 янв. С. 13).

Гэты доўгі пералік мае самую непасрэдную сувязь з прадметам нашае гаворкі – з тэматычным абсягам як практычнай журналістыкі,

так і навукова-даследчай. (Да прыкладу, у 2011 годзе была абаронена дыпломная работа на тэму «Праблема наркаманіі ў асвятленні беларускімі СМІ».)

Тэматыка дыпломных работ прадугледжвае *шматаспектавае* даследаванне, а гэта значыць, тэмы могуць мець падобнае гучанне, але разглядацца ў розных аспектах. Напрыклад, тэма «Сучасны рэгіянальны друк» можа даследавацца ў аксіялагічным, кагнітыўным, семіялагічным, культуралагічным, лінгвакраіназнаўчым, гістарычным і іншых аспектах.

Дыпломнае даследаванне па журналістыцы можа быць *міждысцыплінарным*, калі навуковая праблема асэнсоўваецца з розных бакоў: псіхалагічнага, філасофскага, паліталагічнага і іншага дзеля таго, каб гэтыя рознабаковыя «сэнсы» паспрыялі павышэнню крэатыўнага ўзроўню сучасных СМІ.

## ВЫБАР ТЭМЫ

Хаця выбар тэмы і вельмі адказны крок, але асаблівых праблем на гэтай прыступцы для дыпломніка, як правіла, няма. Арыенцірам у выбары тэмы навуковага даследавання з’яўляецца прафесійны досвед выпускніка ў галіне журналістыкі. Тэмы дыпломных работ фармулююцца на кожнай з дзевяці кафедраў Інстытута журналістыкі БДУ паводле тэматыкі асноўных навучальных курсаў, спецкурсаў, якія ўваходзяць у вучэбны план наступных кафедраў: тэорыі і метадалогіі журналістыкі; перыядычнага друку; тэлебачання і радыёвяшчання; тэхналогій камунікацыі; замежнай журналістыкі і літаратуры; гісторыі журналістыкі; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; літаратурна-мастацкай крытыкі. Адукацыйны накірунак кожнай кафедры выпускнікам Інстытута знаёмы: даводзілася не толькі здаваць залікі, экзамены па навучальных дысцыплінах, але, што вельмі важна ў кантэксце нашай размовы, пісаць курсавыя работы, рэфераты, пачынаючы з 2-га курса. Хто не ленаваўся ўнікнуць у тэорыю нашага журналісцкага досведу («знания») і час ад часу звяраў з ёю свае творчыя набыткі, хто не фармальна паставіўся да выканання заданняў па курсавых работах (забеспячэнне іх эмпірычным

матэрыялам, навуковым апаратам, асэнсаванне даследчых методык, выкарыстанне пэўных метадаў аналізу і інш.) і ў выніку атрымаў асалоду ад нечаканых для сябе адкрыццяў, а заадно і высокую ацэнку суровага навуковага кіраўніка, той спакойна і з цікавасцю ўвойдзе ў працэс падрыхтоўкі дыпломнага твора.

Своечасова пазнаёміўшыся з тэмамі дыпломных работ – пакуль яны яшчэ не зацверджаныя афіцыйна – выпускнік мае права прапанаваць сваю тэму. Найперш гэта можа быць тэма творчай дыпломнай работы, эмпірычную базу якой складаюць публікацыі выпускніка, што мелі месца ў СМІ, у адрозненне ад даследчай дыпломнай работы, эмпірычную базу якой складаюць чужыя творы. Пры ўмове належнага абгрунтавання тэмы з боку выпускніка і дамоўленасці з навуковым кіраўніком тэма, ці то творчай, ці то даследчай работы, уключаецца загадчыкам кафедры ў тэматыку дыпломных работ. Выпускнікі-дыпломнікі строга ў вызначаны Інстытутам журналістыкі БДУ тэрмін падаюць заяву на імя загадчыка адпаведнай выпускаючай кафедры з просьбай зацвердзіць тэму дыпломнай работы і прызначыць канкрэтнага выкладчыка навуковым кіраўніком. Калі выпускнік не вызначыўся з навуковым кіраўніком, кафедра прызначае яго сама, зыходзячы з тэмы дыпломнай работы і навуковых інтарэсаў кіраўніка.

Да ўсяго сказанага варта дадаць наступнае. Вельмі добра, калі тэмы дыпломных работ выспяваюць падчас вывучэння дысцыплін спецкурсаў, курсаў па профілі: для таго яны і выкладаюцца, каб студэнт мог паглыбіцца ў праблему і ўсебакова даследаваць яе. У гэтай сувязі назаву дыпломныя работы, выкананыя па праблематыцы прачытанага мною спецкурса «Журналісцкая дзейнасць у інфармацыйнам агенцтве». Адна з іх – «Информационные агентства в системе СМИ: специфика творчества», якая перарасла ў магістарскую дысертацыю «Специфика творческой деятельности национальных информационных агентств в системе СМИ (на материалах БелТА и РИА “Новости”)» (2009), пра што ўзгадвалася ў **Частцы I**; другая – «Сацыяльная праблематыка ў матэрыялах БелТА» (2009). Усе тры працы ацэненыя найвышэйшым балам. Такая практыка навуковой арыентацыі студэнтаў у нашым Інстытуце існуе і не павінна пераводзіцца.

*Узор заявы на зацвярджэнне тэмы дыпломнай работы*

Загадчыку кафедры перыядычнага друку
Інстытута журналістыкі БДУ
дацэнту А. К. Сворабу
студэнта 5-га курса
(спецыяльнасць «Журналістыка
(друкаваныя СМІ)»;
дзённая форма навучання)
Трафімовіча Антона Анатольевіча

Заява

Прашу зацвердзіць тэму дыпломнай работы «Сацыяльна-эканамічная праблематыка ў штотыднёвіку "Аргументы и факты в Белоруссии" (творчая работа)» і прызначыць навуковым кіраўніком Карповіч Марыю Пятроўну, кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі.

1 верасня 2009 г. Подпіс

## НАВУКОВЫ КІРАЎНІК

Адразу хачу зазначыць, што празмернае спадзяванне з боку дыпломніка на ўдзел навуковага кіраўніка ў напісанні дыпломнай работы беспадстаўнае. Хаця 26 акадэмічных гадзін, адведзеных на кіраўніцтва, здавалася б, і не мала. У той жа час ігнараванне навуковага кіраўніка – што часам назіраецца ў нашай практыцы – можа абярнуцца для выпускніка нават нядопускам да абароны, не кажучы ўжо пра нізкі атэстацыйны бал. Каб гэтага не здарылася, найпершым крокам навуковага кіраўніка і дыпломніка павінна быць іх *неадкладная сустрэча*, каб абмеркаваць *канцэпцыю* дыпломнага даследавання і на яе падставе занатаваць змест дыпломнай работы ў прыкладнай фармулёўцы глаў (як правіла, гэта 3 главы), зыходзячы з характару як тэарэтычнай, так і эмпірычнай базы даследавання. (Сустрэчу часцей за ўсё даводзіцца ініцыіраваць навуковаму кіраўніку, бо дыпломнік можа надоўга яе адкласці.)

Што такое *канцэпцыя*? Каб пазбегнуць ілюзіі – «хлуслівага ўяўлення аб прадмеце», якое часта назіраецца ва ўспрыманні паняцця *канцэпцыя*, моднага ў маўленчым абыходку, прывяду яго акадэмічную дэфініцыю (азначэнне).

***Канцэпцыя*** (лац. conceptio – паняцце, сістэма) 1) сістэма поглядаў на тыя ці іншыя з'явы, накіроўваючая ідэя для іх асвятлення; спосаб разгляду якіх-небудзь з'яў, пэўны спосаб усведамлення чаго-небудзь; 2) асноўная думка альбо вядучы замысел, канструктыўны прынцып розных відаў дзейнасці альбо розных творчых дзеячаў (мастакоў, пісьменнікаў, вучоных і інш.) [76, с. 476]. Менавіта правільная канцэпцыя дыпломнай работы (творчай) на тэму «Сацыяльна-эканамічная праблематыка ў "Аргументах и фактах в Белоруссии"» (2010), сфармуляваная ў першую маю сустрэчу як навуковага кіраўніка з дыпломнікам, паспрыяла вызначэнню зместавага накірунку ўсяго даследавання: сэнсавай структуры, кампазіцыі, адпаведнага навуковага апарату. Канцэпцыя даследавання палягала ў тым, каб прааналізаваць адлюстраваную ў *творчай частцы* (у аўтарскіх матэрыялах) «сістэму поглядаў» журналіста-дыпломніка на фоне «сістэмы поглядаў», адлюстраванай ва ўрадавых праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. А гэта значыць, увайсці ў такія інстытуцыйныя прадметныя галіны масмедыйных даследаванняў, як СМІ і сацыяльна-эканамічныя інстытуты; СМІ і ўлада; СМІ і грамадства. Канцэпцыя дыпломнага даследавання абумовіла і яго метады, і яго тэрміналагічную базу. («У тэорыі журналістыкі, – зазначае ва "Уводзінах" аўтар дыпломнай работы, – даецца толькі азначэнне тэрміна "сацыяльная журналістыка", але не раскрываецца тэматыка матэрыялаў, што ўваходзяць у гэтае паняцце. Нераспрацаванасць тэмы і стала адной з прычын таго, што я абраў яе для дыпломнай работы».)

(На с. 33–52 нашага метадычнага дапаможніка ў якасці ўзору падаюцца фрагменты з названай дыпломнай работы.)

Навуковы кіраўнік параіць дыпломніку, якія тэарэтычныя крыніцы варта выкарыстаць першапачаткова. Мы пастараліся скласці «Бібліяграфічны спіс літаратуры па журналісцкай тэматыцы (для першапачатковага выкарыстання аўтарам дыпломнай работы)» (с. 76–87). Далейшы пошук навуковых крыніц – гэта клопат самога выпускніка. (Кожную новую крыніцу раю дыпломніку адразу занатаваць паводле

Дзяржстандарту, каб потым, пры неабходнасці, без праблем унесці яе ў спіс выкарыстанай літаратуры.)

Навуковы кіраўнік падкажа аўтару дыпломнага даследавання, якія існуюць метады (сістэмы метадаў) збору эмпірычнага матэрыялу даследавання і метады даследавання праблемы дыпломнай работы ў цэлым. (Эмпірыя ад грэч. empeiria – вопыт; эмпірычны – заснаваны на вопыце.)

І яшчэ адзін клопат для навуковага кіраўніка. «Анализируя авторский оригинал произведения (у нашым выпадку – гэта дыпломная работа. – *М. К.*), редактор (навуковы кіраўнік. – *М. К.*) обязан оценить значимость его различных частей и соотношение между ними. Нужно убедиться, что текст не перегружен второстепенными материалами, которые представляют собой черновые, предварительные, рабочие варианты без необходимых обобщений, выводов. …Не следует удовлетворяться только тем, что научное произведение имеет достаточно выраженное деление на вводную, основную и заключительную части. *Не менее важно установить, насколько логично деление основной части на разделы, главы, параграфы и абзацы. Система рубрик является наглядной формой реализации внутренней структуры научного произведения. Однако не следует принимать без анализа рубрикацию, предложенную автором* (вылучана намі. – *М. К.*). Может случиться так, что предложенное им оглавление не во всем отражает содержание произведения. …Рубрикация является важным средством, обеспечивающим реализацию авторского замысла» [90, с. 53]. Чым больш трывала будзе забяспечана аўтарам сэнсавая рубрыкацыйная сувязь у дыпломнай рабоце, тым меней рэкамендацый будзе зыходзіць ад навуковага кіраўніка.

Навуковы кіраўнік абавязаны паклапаціцца пра своечасовае правядзенне *перадабароны* («предзащиты») дыпломных работ на кафедры. Перадабарона праводзіцца за 2 тыдні да таго, як аддаць дыпломную работу на рэцэнзаванне. Перадабарона – гэта не што іншае, як апрабацыя вынікаў дыпломнага даследавання, іх навукова-практычнай вартасці, адпаведнасці даследавання крытэрыям яго ацэнкі. Перадабарона дае магчымасць аўтару дыпломнай работы ўдасканаліць яе паводле рэкамендацый кафедральнай камісіі.

Рэцэнзент згодна з афіцыйна вызначаным тэрмінам павінен атрымаць работу за 10 дзён да абароны з водгукам навуковага кіраўніка

і выстаўленай ім адзнакай (гл.: крытэрыі ацэнкі, с. 89–93). У канцы дыпломнай работы, пасля спісу выкарыстанай літаратуры, дыпломнік ставіць свой подпіс. Пры наяўнасці станоўчай рэцэнзіі загадчык кафедры на тытульным лісце пазначае: «Дапушчана да абароны», ставіць подпіс і дату.

Спадзяюся, што наш метадычны кампендыум пазбавіць навуковага кіраўніка ад нудных тлумачэнняў па структурнай арганізацыі дыпломнай работы, па тэхнічным яе афармленні і ў выніку вызваліцца час, каб больш увагі надаць зместавай якасці твора – яго асноўнай частцы.

## ТВОРЧАЯ ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА

Творчая дыпломная работа грунтуецца на *тэарэтычным падмурку праблематыкі*, заяўленай у тэме дыпломнага даследавання, з аднаго боку, і на *публікацыях аўтара-выпускніка*, тэматычна звязаных з абазначанай у тэме праблематыкай, – з другога. Публікацыі аўтара дыпломнай работы, інакш – яе творчая частка, не ёсць усяго толькі матэрыяльны дадатак да тэарэтычнай часткі. Аўтарскія публікацыі – гэта матэрыял, на падставе якога вызначаюцца ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста, яго здольнасці сваёй творчасцю ўплываць на вырашэнне актуальных праблем, якія стаяць перад дзяржавай і грамадствам, а таксама яго ўменне выклікаць чытацкі інтарэс і наладзіць належную сувязь з масавай аўдыторыяй. Усё сказанае вымагае ад аўтара забяспечыць дастатковы аб’ём творчай часткі ў яе працэнтных суадносінах з тэарэтычнай часткай і ў колькасным выражэнні, дастатковым для вырашэння даследчых задач, для доказнасці тых палажэнняў, якія выносяцца на абарону. Дыпломная работа (творчая) – той жа навуковы жанр, што і даследчая дыпломная работа.

### Патрабаванні да творчай часткі дыпломнага даследавання

1. Усе творчыя матэрыялы аўтара павінны быць тэматычна звязаны з праблематыкай дыпломнага даследавання.
2. *Аб’ём* творчай часткі ў сукупнасці не можа быць меншым за 60 % ад агульнага аб’ёму дыпломнай работы ў нарматыўным яе варыянце –

ад 50 да 60 старонак. Колькасць публікацый павінна быць дастатковай для вычарпальнага ілюстравання тэзісаў тэарэтычнага раздзела, а гэта, як правіла, не меней за 30 адзінак (без суаўтарства). Колькасць апублікаваных матэрыялаў у электронных СМІ і колькасць дызайнерскіх і афармленчых работ вызначаецца адпаведнай кафедрай з улікам узроўню іх працаёмістасці.

3. Кожны аўтарскі матэрыял павінен быць пракаментаваны ў адпаведнай главе дыпломнай работы на прадмет яго практычнай вартасці ў вырашэнні дзяржаўных праблем і яго адпаведнасці патрабаванням да прафесійнай журналістыкі.

4. Да разгляду прымаюцца творчыя матэрыялы, апублікаваныя ў рэспубліканскіх, рэгіянальных, замежных СМІ. Апошняя публікацыя павінна выйсці з друку не пазней як за два месяцы да абароны дыпломнай работы.

Творчая частка дыпломных работ, у якіх даследуецца *методыка літаратурнага рэдагавання*, можа быць прадстаўлена толькі выдадзенымі творамі (1-2 адзінкі), у выхадных звестках якіх значыцца прозвішча рэдактара – выпускніка-дыпломніка Інстытута журналістыкі БДУ. У якасці *творчай часткі* могуць быць залічаны і надрукаваныя літаратурныя творы самога дыпломніка (кнігі, брашуры – 2-3 выданні), калі ў дыпломнай рабоце даследуецца праблема творчага супрацоўніцтва дыпломніка-аўтара з рэдактарам у працэсе падрыхтоўкі рукапісу да выдання.

## Ацэнка творчай часткі дыпломнай работы ў балах

Пры ацэнцы творчай дыпломнай работы бярэцца пад увагу адзнака за творчую частку даследавання (аўтарскія матэрыялы).

Адзнакі «10» і «9» балаў – творчая частка дыпломнай работы адпавядае кожнаму з 4 пералічаных крытэрыяў; «8» і «7» – творчая частка адпавядае 3 крытэрыям (1, 2, 4); «6» і «5» – творчая частка адпавядае 2 крытэрыям (1, 2); «4» – творчая частка адпавядае першаму, асноўнаму, крытэрыю (1); «3» – творчая частка не адпавядае пералічаным крытэрыям.

## УЗОРЫ НАПІСАННЯ І АФАРМЛЕННЯ ТВОРЧАЙ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ (ФРАГМЕНТЫ)

*Узор тытульнага ліста*

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**
**Факультэт журналістыкі**

**Кафедра тэорыі і метадалогіі журналістыкі**

**Сацыяльна-эканамічная праблематыка ў штотыднёвіку «Аргументы и факты в Белоруссии» (творчая работа)**

Дыпломная работа
студэнта 5-га курса
(спецыяльнасць «Журналістыка
(друкаваныя СМІ)»;
дзённая форма навучання)
ТРАФІМОВІЧА Антона Анатольевіча

Навуковы кіраўнік –
канд. філал. навук дацэнт
КАРПОВІЧ Марыя Пятроўна

Рэцэнзент –
доктар паліт. навук прафесар
БАРАНАВА Алена Уладзіміраўна

Мінск
2010

## ЗМЕСТ

**Уводзіны** ... 3

**Глава 1 Эканамічны стан Беларусі: перадумовы, сучаснасць, задачы** ... 6

1.1 Эканоміка пераходнага тыпу ... 6

1.2 Дзяржаўная палітыка ў рэгуляванні эканомікі ... 8

1.3 Банкаўская сістэма і рэгуляванне валютнага курсу ... 14

**Глава 2 Эканамічная праблематыка ў «АиФ» (на матэрыяле аўтарскіх публікацый)** ... 20

2.1 Структурныя складнікі нацыянальнай эканомікі ў матэрыялах выдання ... 20

2.2 Транспарт і сувязь у матэрыялах «АиФ» ... 31

**Глава 3 Сацыяльная праблематыка ў «АиФ» (на матэрыяле аўтарскіх публікацый)** ... 38

3.1 Беларусь – сацыяльная дзяржава ... 38

3.2 «АиФ» у вырашэнні побытавых клопатаў чытачоў ... 42

**Заключэнне** ... 58

**Спіс выкарыстанай літаратуры** ... 61

**Дадатак** ... 64

## УВОДЗІНЫ

Пад азначэнне *сацыяльна-эканамічная праблематыка* трапляе амаль уся дзейнасць чалавека ў грамадстве. Ад нараджэння чалавек становіцца аб'ектам уліку і статыстыкі, ягонае здароўе – даследаваннем медыцыны, матэрыяльны дастатак яго бацькоў – інтарэсам падатковай інспекцыі. І на кожным кроку свайго жыцця чалавек становіцца аб'ектам сацыяльна-эканамічнай дзейнасці – пабудова жылля, выбар маркі новага аўтамабіля, адпачынак, аплата навучання дзяцей у ВНУ і інш.

Несумненна, у такім шырокім плане сацыяльна-эканамічная праблематыка – найважнейшая ў любой грамадска-палітычнай газеце. Паведамленне аб прыняцці новай дырэктывы, закрыццё завода ў абласным цэнтры, дамова пра супрацоўніцтва з новай краінай – з гэтага фарміруецца сацыяльна-эканамічнае жыццё краіны «зверху». Але ёсць і «ніжняе» жыццё грамадства – лёсы людзей. Не зроблены капітальны рамонт, праблемы з атрыманнем субсідыі на будаўніцтва прыватнага дома – гэта праявы доўгіх ланцугоў сацыяльна-эканамічных адносін – ад прыняцця пэўнага закона да яго рэалізацыі на месцы. Усё гэта – тэмы матэрыялаў газет, часопісаў, тэлебачання, радыё, інтэрнэт-рэсурсаў, якія ствараюць другое жыццё – медыярэальнасць, дзе адлюстроўваецца ці не адлюстроўваецца сацыяльна-эканамічнае жыццё краіны. Ва ўсім гэтым і палягае **актуальнасць** тэмы дыпломнай работы.

Нягледзячы на пранікненне тэхналогій у сферу камунікацыі і медыя, сярод усіх сродкаў масавай інфармацыі газеты застаюцца вельмі важнай крыніцай інфармацыі. Яны не толькі паведамляюць навіны, чым звычайна займаюцца інфармагенцтвы, радыё і тэлебачанне, але і даюць аналіз падзеяў. Наклад газет сведчыць пра попыт насельніцтва на гэтыя СМІ. Асабліва важным аспектам газеты з'яўляецца **зваротная сувязь з чытачом**, якія могуць выказвацца на старонках выданняў: праз інтэрв'ю, публікацыю іх лістоў, праз пытанні да газеты і інш.

**Творчая частка** маёй дыпломнай работы цалкам скіравана на «ніжняе» жыццё грамадства. (Дадатак аўтарскіх матэрыялаў уключае 42 найменні. З іх праз усе главы дыпломнай работы праходзіць 25 матэрыялаў.)

Сёння няшмат даследаванняў па адлюстраванні сацыяльна-эканамічнай праблематыкі ў газетах. У тэорыі журналістыкі даецца толькі азначэнне тэрміна *сацыяльная журналістыка*, але не раскрываецца тэматыка матэрыялаў, якія ўваходзяць у гэтае паняцце, як

яны павінны падавацца. Нераспрацаванасць тэмы і стала адной з прычын таго, што я абраў яе для дыпломнай работы. У штотыднёвай газеце «Аргументы и факты в Белоруссии», трэцяй па накладзе ў Беларусі і першай сярод штотыднёвых газет (180 тыс. экзэмпляраў), сацыяльна-эканамічная праблематыка прадстаўлена больш шырока. Яшчэ з савецкіх часоў («АиФ» выходзіць з 1978 года) газета карысталася вялікім попытам сярод чытачоў. Сувязь з чытачамі, адказы на іх пытанні – адзін з найважнейшых фактараў папулярнасці газеты. Галоўны рэдактар «АиФ» Мікалай Зяцькоў «сакрэтнай зброяй» штотыднёвіка называе менавіта адлюстраванне на старонках газеты пытанняў, якія турбуюць чытачоў. Адказы на канкрэтныя чытацкія лісты датычна сацыяльнай сферы, эканомікі, палітыкі – тое, чым «АиФ» адрозніваецца ад іншых газет.

Адно з пацвярджэнняў важнасці сацыяльна-эканамічнай праблематыкі ў «АиФ» – першае месца ў Нацыянальным конкурсе друкаваных сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь «Залатая Літара» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы сацыяльнай тэматыкі» (2010). **Сярод матэрыялаў на сацыяльна-эканамічную тэматыку ў газеце немалая доля і маіх, аўтарскіх, матэрыялаў, што дазволіла дыпломную работу намінаваць як творчую.**

**Аб'ектам** дыпломнага даследавання з'яўляецца сацыяльна-эканамічная палітыка ў Беларусі і яе адлюстраванне ва ўрадавых праграмах эканамічнага развіцця краіны. **Прадмет даследавання** – асвятленне сацыяльна-эканамічнай праблематыкі ў рэчышчы дзяржаўнай палітыкі краіны на старонках «Аргументов и фактов в Белоруссии» (на матэрыяле творчай часткі дыпломнай работы).

**Мэта работы** – на падставе кантэнт-аналізу матэрыялаў «АиФ» на сацыяльна-эканамічную тэму выявіць іх грамадскую вартасць, узровень інфарматыўнасці і адпаведнасць дзяржаўнай палітыцы. Для дасягнення мэты пастаўлены наступныя **задачы**:

- ахарактарызаваць сацыяльна-эканамічны стан Беларусі;
- адлюстраваць ролю штотыднёвіка «АиФ» у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі эканамічнага развіцця краіны;
- вызначыць месца ўласных матэрыялаў у сацыяльна-эканамічным кантэксце газеты «АиФ в Белоруссии».

Кантэнт-аналіз творчай часткі ў сугуччы яе матэрыялаў з урадавымі праграмамі сацыяльна-эканамічнага развіцця з набалелымі праблемамі беларусаў – галоўны **метад** даследавання.

**Навізна** даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай навуцы аналізуецца месца сацыяльна-эканамічнай тэматыкі на старонках расійскай газеты, што выходзіць у Беларусі. Творчы

ўзровень матэрыялаў беларускай рэдакцыі на фоне расійскага крэатыву – гэта ўпершыню.

Работа мае **практычную значнасць**. Яе вынікі можна выкарыстоўваць у практыцы грамадска-палітычных газет Беларусі незалежна ад выдаўца газеты і яе палітычнай арыентаванасці. Але ў першую чаргу работа можа быць карыснай для рэдакцыі самога штотыднёвіка «АиФ в Белоруссии».

*Узоры ўключэння аўтарскіх публікацый*
*у тэксты глаў (фрагменты)*

## Глава 1 Эканамічны стан Беларусі: перадумовы, сучаснасць, задачы

### 1.3 Банкаўская сістэма і рэгуляванне валютнага курсу

Для таго каб весці міжнародны гандаль ва ўмовах існавання розных валют, чалавецтва вынайшла ўніверсальны механізм узаемных разлікаў – валютны рынак. Ягоная аснова – гэта прапорцыі абмену валют, ці валютныя курсы. Валютны курс – кошт адной нацыянальнай грашовай адзінкі ў грашовых адзінках іншых краін. Ён залежыць ад суадносін попыту і прапановы на тую ці іншую валюту. У сваю чаргу памеры попыту і прапановы залежаць ад аб'ёмаў узаемнага гандлю паміж пэўнымі краінамі.

На практыцы валютны курс уплывае на эканоміку краіны наступным чынам. Чым больш таннай становіцца валюта адной краіны, тым больш тавараў за мяжу яна можа прадаць. Таму, калі ў краіне здараецца эканамічны крызіс, каб выправіць сітуацыю і палепшыць экспарт тавараў за мяжу, урад можа пайсці на дэвальвацыю – афіцыйнае зніжэнне дзяржавай курсу абмену сваіх грашовых знакаў на валюты іншых краінаў, т. б. павелічэнне колькасці гэтых знакаў, якія можна атрымаць за кожную адзінку замежнай валюты.

Курс беларускага рубля – адлюстраванне эканомікі краіны. У пачатку 1990-х гадоў ва ўмовах гіперінфляцыі адносна замежных валют беларускі рубель стаў больш танным у тысячы разоў. Гэта стала прычынай дэнамінацыі валюты ў 2000 годзе, калі беларускі рубель паменшылі ў тысячу разоў. Курс рубля зніжаўся і потым, але значна павольней. Рэзкіх скачкоў не адбывалася да 2 студзеня 2009 года, калі беларускі рубель быў дэвальваваны на 20 % адносна долара ЗША. Такая дэвальвацыя нацыянальнай валюты была адной з умоў выдачы Беларусі крэдыту Міжнародным валютным фондам [33].

Пасля студзеньскай дэвальвацыі выказваліся меркаванні і пра наступную дэвальвацыю, з'яўляліся нават чуткі пра непазбежную дэнамінацыю беларускага рубля. Праз год пасля дэвальвацыі 2009 года ў «АиФ» быў падрыхтаваны аўтарскі матэрыял, дзе ўздымалася пытанне, ці магчыма ў Беларусі дэнамінацыя, а на гэтай падставе і эмісія ўласных манет.

(2010. 8 студз. С. 12)

**В Беларуси могут ввести монеты.**
**Но только после стабилизации экономики**

...**ЗАМЕСТИТЕЛЬ начальника отдела информации Нацбанка Беларуси Михаил ЖУРАВОВИЧ** на вопрос «АиФ» о возможности в Беларуси введения монеты отвечает утвердительно. По его мнению, у нас действительно могут появиться в обращении монеты. Но для этого необходимо выполнить два условия. Во-первых, снизить в разы уровень инфляции. Во-вторых, сделать экономику Беларуси стабильной. С сегодняшним уровнем инфляции в Беларуси введение железной денежной единицы просто нецелесообразно.

– Сегодня монеты есть, а завтра их инфляция съест, – поясняет Михаил Журавович.

Представитель Нацбанка согласен с тем, что после стабилизации экономики мы можем провести деноминацию, а потом ввести монеты. На вопрос же о появившихся летом в интернете фотографиях белорусских монет, отчеканенных в Словакии и успевших накалить и без того жаркие споры о деноминации белорусского рубля, Михаил Журавович разъяснил, что Национальный банк постоянно готовит запасные варианты развития монетарной политики в Беларуси, берёт пробы монет на разных монетных дворах. Одной из ставших известных публике стала проба чеканки в словацком городе Кремница.

* * *

Сярод частых пытанняў чытачоў на эканамічную тэму варта адзначыць пытанні пра вяртанне савецкіх укладаў. Нашмат часцей да гэтай тэмы чытачы пачалі звяртацца пасля таго як у Расіі пачалі выдаваць грошы былым савецкім укладчыкам. Неаднаразова гэта тэма падымалася ў «АиФ», у тым ліку ў шэрагу аўтарскіх матэрыялаў (гл. дадатак, с. 15, «А вклады все ждут»).

**Высновы.** Ад СССР Беларусь атрымала ў спадчыну планавую эканоміку. У сярэдзіне 1990-х гадоў пры выбары шляху

рэфармавання эканомікі ў краіне быў абраны шлях эвалюцыйнага развіцця, які мае як плюсы (абароненасць бедных пластоў насельніцтва), так і мінусы (і праз 20 гадоў у краіне карыстаюцца неэфектыўнымі метадамі адміністрацыйна-планавай сістэмы). Хоць у Беларусі і забяспечаны стабільны рост ВУП, метады дасягнення гэтага высокага ўзроўню павінны сёння пераходзіць ад адміністрацыйных да рынкавых. Як і большасць сфераў эканомікі, валютны курс беларускага рубля ў краіне моцна рэгулюецца дзяржавай. З-за таго што беларуская эканоміка галоўным чынам экспартаарыентаваная, рэспубліка, як і большасць краін свету, адчула на сабе наступствы сусветнага эканамічнага крызісу.

На прыкладзе аўтарскіх матэрыялаў бачна, што тэма эканомікі шырока асвятляецца ў «АиФ». Прадстаўленыя матэрыялы носяць як аналітычны характар, так і характэрны для «АиФ» практычны. У кожным разе ўсе матэрыялы суправаджаюцца каментарамі кампетэнтных экспертаў.

## Глава 2 Эканамічная праблематыка ў «АиФ» (на матэрыяле аўтарскіх публікацый)

### 2.1 Структурныя складнікі нацыянальнай эканомікі ў матэрыялах выдання

**Сельская гаспадарка.** Прыкладна 2 % рознічнага тавараабароту ў Беларусі складаюць прадукты харчавання сельскай гаспадаркі і тавары, якія выпрабляюцца з сельскагаспадарчай сыравіны. На 2004 год у гаспадарцы было занята 10,7 % працоўнага рэсурсу, на яго долю прыходзілася 8,9 % ВУП. З пачатку 1990-х гадоў у Беларусі назіраецца тэндэнцыя да росту долі раслінаводства і спаду жывёлагадоўлі (35,2 % і 64,8 % у 1990 годзе, 54,2 % і 45,8 % у 2004 годзе суадносна). Праз 15 гадоў збор бульбы ў Беларусі павялічыўся амаль на 20 %, гародніны – на 183 %. Вытворчасць жа мяса скарацілася амаль ўдвая [19, с. 247–259].

Нягледзячы на штогадовыя высокія аб'ёмы сабраных збожжавых культур, Беларусь імпартуе зерне з-за мяжы. І нават, калі ўраджай 2008 года склаў рэкордныя 8 мільёнаў тон зерня, імпарт зерня ў фізічным выражэнні ў той год павялічыўся на 15,8 %, а ў коштавым – на 35,6 % [26, с. 147].

Вытворцы сельска-гаспадарчых тавараў працуюць у прывілеяваных умовах і ў гады росту эканомікі, нягледзячы на агульны крызіс у комплексе, змаглі забяспечыць рост асноўных паказчыкаў. Рост вытворчасці мяса за 2005–2008 гады адбыўся на 26,6 %,

цэльнамалочнай прадукцыі – на 23,2, тлустых сыроў – на 57,4, алею – на 53,6, каўбас – на 18,8 %. Сярод няўдалых праектаў найбольш яскрава праявілася праграма развіцця цукровай прамысловасці. З 2005 па 2008 год рост аб'ёму гатага віду прадукцыі скараціўся на 18,1 %. І гэта пры тым, што падатак на дададзеную вартасць для імпартнага цукру складае не 18 %, як для ўсіх тавараў, а 24 % [25].

Вялікая доля развіцця, у прыватнасці малочнай прамысловасці, прыпадае на арыентаванасць многіх беларускіх вытворцаў малочнай прадукцыі на расійскі рынак. Гэта стала відавочным пасля беларуска-расійскай «малочнай вайны», калі вырашаць праблемы з пастаўкамі беларускага малака ў Расію былі вымушаны палітыкі ў асобе самога Прэмьер-міністра Сяргея Сідорскага.

У «АиФ» тэма сельскай гаспадаркі пастаянна прысутнічае. У дыскусіі па праблемах сельскай гаспадаркі на старонках газеты прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, навукоўцы, даследчыкі. Пастаянна публікуюцца ў штотыднёвіку і пытанні-адказы на розныя тэмы гэтага сектара эканомікі. Напрыклад, аўтарскі матэрыял – адказ на пытанне пра перспектывы авечкагадоўлі ў Беларусі.

(2009. 25 ліст. С. 11)

**А овцы целы?**

**Собираются ли в Беларуси развивать овцеводство? За хорошей шерстью пока приходится ездить в Турцию.**

**Ю. Корней, Минск**

**ОТВЕЧАЕТ министр сельского хозяйства Беларуси Семён ШАПИРО:**

– Я КОГДА-ТО в молодости руководил предприятием, где занимались и овцами. В те годы я понял, что экономическая эффективность овцеводства в нашей стране очень низкая. Обеспечить наши мощности шерстью даже в те годы было проблематично. Сегодня овцы остались в основном у населения. Шерсть мы закупаем. В наших условиях выращивать овец неэффективно.

* * *

**Капітальнае будаўніцтва.** Найважнейшая дзяржаўная задача ў сферы жыллёвага будаўніцтва на перспектыўны перыяд – забеспячэнне кожнага грамадзяніна камфартабельным, энергаэфектыўным і адносна танным жыллём. Тэму **энергаэфектыўнага будаўніцтва**

газета не аднойчы ўздымала. Справа ў тым, што за хуткасцю будаўніцтва жылых дамоў у Беларусі часта забываюцца на якасць і на тое, што будаваць трэба з перспектывай. Некалькі разоў уздымалася тэма энергаэфектыўнага будаўніцтва на старонках «АиФ».

(2009. 25 лют. С. 15–16)
**Решение жилищного вопроса или «бетонное заражение»?**
**В следующем году в Евросоюзе вступает в силу протокол о запрете строительства энергозатратных домов. В то же время в Беларуси в текущем году планируется введение трёх новых заводов крупнопанельного домостроения, а дома из таких панелей уже изначально энергозатратны. «АиФ» выяснил, может ли жильё быть дешёвым и в то же время не требующим затрат на отопление.**
**...Так, практикующий архитектор Георгий ЗАБОРСКИЙ** считает, что возводимые в настоящее время жилые дома КПД – это непродуманный с точки зрения стратегического строительства шаг:

– То, что строят в Беларуси сегодня, никак не отвечает мировым стандартам в области энергоэффективности жилищного строительства. Все наши дома принадлежат к категории энергозатратных, где энергии на отепление расходуется в 40 раз больше, чем для пассивного дома, построенного так, что он фактически греет сам себя. То, что новые панели делаются с несколько большим слоем утеплителя, кардинально ничего не изменяет, тепло всё равно уходит вертикально: через крышу и фундамент. Планирование на стадии проектирования на самом деле решает проблему только первого жильца квартиры: никто не гарантирует, что следующего владельца квартиры через 20 лет полностью устроит созданная однажды планировка.

* * *

Што цікава, праз паўгода пасля публікацыі гэтага матэрыялу ў Беларусі была прынята пастанова Савета Міністраў «Аб зацвярджэнні комплекснай праграмы па праектаванні, будаўніцтве і рэканструкцыі энергаэфектыўных дамоў у Рэспубліцы Беларусь на 2009–2010 гг., з перспектывай да 2020 года». Згодна з Пастановай да 2015 года краіна мусіць цалкам перайсці на энергаэфектыўнае будаўніцтва. Як высветлілася, распрацоўкай праграмы займаўся акурат Георгій Заборскі, каментар у якога «АиФ» браў у папярэднім матэрыяле. З гэтай нагоды ў новым інтэрв'ю даследчык больш падрабязна распавёў, якім чынам варта рэалізоўваць праграму.

* * *

**2.2 Транспарт і сувязь у матэрыялах «АиФ»**

Зусім у іншым кірунку і іншымі тэмпамі развіваецца мабільная сувязь. Першы аператар мабільнай сувязі стандарту GSM з'явіўся ў 1999 годзе. У 2006 годзе колькасць абанентаў ужо трох аператараў складала 4 мільёны. Па апошніх даных, іх ужо 7,5 мільёна, хоць у 2006 годзе прагназавалася, што колькасць карыстальнікаў мабільнай сувязі ў 2010 годзе складзе 5–5,5 мільёна [2]. Мабільныя аператары выцеснілі і некалі папулярных пэйджынгавых аператараў.

Таксама да галіны сувязі мае дачыненне і інтэрнэт. Разам з распаўсюджваннем інтэрнэту ў Беларусі і павелічэннем колькасці карыстальнікаў шырока абмяркоўваюцца і заробкі ў інтэрнэце. Акрамя таго што сусветнае сеціва стала невычэрпным велізарным сховішчам інфармацыі, яно яшчэ і стварыла многія працоўныя месцы. Над тым, як зрабіць гэтых працоўных месцаў яшчэ больш, разважалі ўдзельнікі канферэнцыі «Дзелавы інтэрнэт» у Мінску, пра што напісана ў аўтарскім матэрыяле.

(2009. 21 кастр. С. 11)

**Когда инвестиции придут в байнет?**

...ТАКЖЕ Юрий Зиссер подвёл и итоги года в жизни белорусского интернета. Так, по разным подсчётам, сегодня в Беларуси от 2,89 до 3,1 млн пользователей интернета, из которых более 500 тыс. – пользователи широкополосного интернета. Если сравнивать эти характеристики со странами-соседями, то Беларусь пока остаётся аутсайдером. Лидирует наша страна только по стоимости интернет-услуг: в то время как в Польше канал 1 Мбит/сек стоит 1567 руб., в Украине – 33 000 руб., то у нас цена подобной услуги составляет 150 000 руб.

Особый акцент во время конференции делался на инвестиции в интернете. «Деловой интернет» совместно с Инкубатором бизнес-проектов БГУИР взял на себя миссию найти людей и компании, которым интересны инвестиции и перспективные интернет-проекты. Организаторы отобрали десять стартапов, которые были представлены на конференции. Авторы проектов имеют возможность продемонстрировать свои идеи, получить рекомендации от профессионалов и, возможно, найти инвесторов. В продолжение темы инвестиций в рамках конференции состоялась сессия «кофе с инвестором».

* * *

У апошнія гады шмат зроблена ва ўкараненні высокіх тэхналогій, якія дазваляюць не карыстацца традыцыйнымі відамі сувязі. Напрыклад, з мінулага года звяртацца ў падатковую інспекцыю можна і праз інтэрнэт, пра што ў «АиФ» быў надрукаваны аўтарскі матэрыял (гл. дадатак, с. 12, «В налоговую больше не ходим?»).

**Высновы.** У зрэзе эканамічных комплексаў Рэспублікі Беларусь паказаны найбольш важныя для эканомікі галіны – паліўна-энергетычны комплекс, будаўніцтва, сельская гаспадарка, транспарт і сувязь. Колькасна пераважаюць матэрыялы на тэму жыллёвага будаўніцтва (7,14 % ад усіх матэрыялаў, якія былі разгледжаны ў дыпломнай рабоце) і транспарту (7,14 %). Тэарэтычная характарыстыка галін знаходзіць адлюстраванне ў аўтарскіх матэрыялах. Пытанні чытачоў маюць як практычны, так і глабальны характар. У некаторых аспектах эксперты «АиФ» прадказвалі стан галіны ў будучым, як гэта здарылася з энергаэфектыўным будаўніцтвам. Што датычыцца сувязі, то газета нагадвае пра магчымасці традыцыйных відаў сувязі і знаёміць чытача з новымі тэхналогіямі галіны.

## Глава 3 Сацыяльная праблематыка ў «АиФ» (на матэрыяле аўтарскіх публікацый)

### 3.2 «АиФ» у вырашэнні побытавых клопатаў чытачоў

Сацыяльную сферу варта разглядаць у розных галінах.

**Адукацыя**. Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі наступныя: прыярытэтнасць адукацыі, абавязковасць агульнай базавай адукацыі, пераход да абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі, даступнасць дашкольнай, прафесійна-тэхнічнай і на конкурснай аснове сярэдняй спецыялізаванай і вышэйшай адукацыі; **пераемнасць** і **непарыўнасць** узроўняў і ступеней адукацыі; нацыянальна-культурныя асновы адукацыі. У Беларусі дасягнуты дастаткова высокі ўзровень граматнасці насельніцтва – 99,7 %. Базавую, агульную сярэднюю і прафесійную адукацыю маюць 98 % занятага насельніцтва.

Роля адукацыі рэзка ўзрасла ў апошні час. Калі ў 1990 годзе яе ўдзельная вага ў ВУП была 2,5 %, то ў 2004 годзе яе доля была ўжо 4,8 %. Па гэтым паказчыку адукацыя займае першае месца ў сацыякультурным комплексе.

Працэнт ахопу дзяцей дашкольнымі ўстановамі ў гарадах складае 91,5 %, у сельскай мясцовасці – 50,5 %. У падсістэме агульнай сярэдняй адукацыі ў 2004/05 навучальным годзе колькасць школьнікаў склала 1,3 мільёна ў 4,3 тысячы навучальных устаноў.

Для Беларусі характэрны новыя тыпы навучальных устаноў – гімназіі, ліцэі, навукова-педагагічныя комплексы ў складзе школы, гімназіі ці каледжа. Працуе 12 прыватных школ. У сярэднеспецыяльным сектары адукацыі функцыянуе 206 навуковых устаноў, адзначаецца рост колькасці навучэнцаў ПТВ і ССТВ. Вельмі цікавая сітуацыя ў Беларусі ў сферы вышэйшай адукацыі. У 1990 годзе колькасць студэнтаў на 10 тысяч насельніцтва складала 180, у той час як сярэднееўрапейскі паказчык быў 300. Праз 15 гадоў колькасць студэнтаў узрасла больш як у 2 разы – да 370 на 10 тысяч насельніцтва [19, с. 310–323]. У гэтай тэндэнцыі можна разглядзець ператварэнне вышэйшай адукацыі ў масавую. На гэтым фоне паўстае праблема прызнання дыпломаў рэгіянальных ВНУ. Створаныя на базе былых педагагічных вучылішчаў і ССПТВ, рэгіянальныя ВНУ, нягледзячы на статус універсітэта, даюць слабейшую адукацыю, чым «старыя» ўніверсітэты. Такое пытанне ў часе прамой лініі па правядзенні ўступнай кампаніі задаў адзін з чытачоў прадстаўніку Міністэрства адукацыі. Чыноўнік жа з гэтай пазіцыяй не пагадзіўся, што было і надрукавана ў «АиФ».

(2009. 24 чэр. С. 25)

**Вузы в регионах не хуже столичных?**
**Насколько в Беларуси котируются новые вузы в регионах? Планирует ли Минобразования открывать новые вузы?**
**Д. Скоробей, Толочин**
**ОТВЕЧАЕТ начальник Управления высшего и среднего образования Юрий МИКСЮК:**

– ВЫСШЕЕ учебное заведение предполагает определённую материально-техническую и учебно-лабораторную базу, наличие квалифицированных кадров и научных школ. Создавать с нуля вуз очень сложно, и сегодня такой необходимости у нас нет. Что же до университетов в Барановичах и Пинске, созданных в последние годы, то они появились не на пустом месте: каждое учебное заведение в своем развитии проходит определённые этапы и может заслуженно повысить свой статус.

Статус наших региональных вузов достаточно высок, а отдельные школы и специальности уже сегодня занимают лидирующие позиции. Широкое признание получила геодезическая школа Полоцкого университета. Разработки Брестского технического университета внедрены при строительстве сложной конструкции крыши амфитеатра в Витебске.

Сегодня не составляет проблемы добраться из любого места республики до вуза, интересующего абитуриента. Поэтому многие специальности можно получить и в региональных вузах. А требования по качеству подготовки специалистов Министерство образования предъявляет ко всем вузам одинаковые.

* * *

**Жыллёва-камунальная гаспадарка.** У сферу жыллёвай палітыкі ўваходзіць як будаўніцтва жылля, так і абслугоўванне жыллёвага фонду, але функцыя Міністэрства ЖКГ зведзена да апошняй. Хаця і з ёй міністэрству справіцца даволі складана. Галоўная прычына, на думку афіцыйных асоб, заключаецца ў нізкіх коштах на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва. Так, сёння грамадзяне Беларусі аплачваюць ад 30 да 50 % выдаткаў на аказанне паслуг ЖКГ. Згодна з прынятай у 2003 годзе Канцэпцыяй развіцця сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, узровень пакрыцця выдаткаў насельніцтвам павінен складаць 100 % [19, с. 375–378]. Дакумент прадугледжвае, напрыклад, дэманапалізацыю сферы аказання паслуг у сістэме ЖКГ. У той жа час існуе даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, па якім жыллёва-камунальныя паслугі ў мэтах сацыяльнай абароны слабаабароненых грамадзян не могуць даражэць больш за 5 долараў на год.

Яшчэ адна праблема сферы – вертыкальная сістэма ўлады, у якой жыллёва-эксплуатацыйныя службы падпарадкоўваюцца не Міністэрству ЖКГ, а мясцовай адміністрацыі. А таму, калі ўзнікае канфлікт з ЖЭСам, скардзіцца на яго можна толькі ягонаму начальніку – выканкаму.

(2010. 28 крас. С. 20)

**Кому жаловаться на ЖЭС?**

**Куда обращаться, если ЖЭС не справляется со своими обязанностями? У нас в подъездах (ул. Одоевского, ЖЭС № 16 г. Минска) никто не убирает. Чтобы заменили лампочку, надо написать несколько заявлений: с одного не срабатывает. Мы «коммуналку» исправно оплачиваем. Как нам тогда вернуть деньги за невыполненные услуги? Как ещё можно заставить ЖЭС работать?**

**Валентина Евгеньевна, Минск**

ОБЯЗАННОСТИ по обеспечению надлежащего содержания подъездов и других вспомогательных помещений жилого дома и придомовой территории возложены на ЖЭС, сообщили «АиФ» в

Министерстве жилищно-коммунального хозяйства. Если ЖЭС не выполняет эти обязанности, необходимо обращаться в вышестоящие организации (жилищное ремонтно-эксплуатационное объединение района, государственное производственное объединение «Минское городское хозяйство») или в районную администрацию.

Кроме того, согласно закону «О защите прав потребителей жилищно-коммунальных услуг», если независимая проверка или судебное разбирательство подтвердит факт неоказания жилищно-коммунальной услуги, жители вправе требовать оказания этой услуги и не оплачивать её за период с момента, указанного в претензионном акте, акте независимой проверки (экспертизы) или судебном постановлении, до момента начала (возобновления) оказания услуг.

Для проведения независимой проверки (экспертизы) санитарно-технического состояния жилого дома и начисления оплаты за жилищно-коммунальные услуги необходимо обратиться в местный исполком.

Также граждане в сфере жилищных отношений имеют право на судебную защиту своих жилищных и связанных с ними прав и интересов (ст. 9 Жилищного кодекса).

* * *

З прычыны таго што вельмі часта мясцовыя ўлады не ідуць насустрач людзям у вырашэнні канфліктаў з ЖЭСам, людзі пішуць лісты ў газеты, на якія ўскладваюць апошнюю надзею. Журналісты не абмінаюць звароты. Так было, напрыклад, увосень 2008 года з домам на вуліцы Маякоўскага ў Мінску.

(2008. 1 кастр. С. 16)

**Крыша преткновения**

**С кого спрашивать, если капитальный ремонт не впрок жильцам?**

**О том, что в их доме ведётся капитальный ремонт, некоторые жители дома № 117, корпус 2, по ул. Маяковского уже не раз пожалели. Ведь теперь каждый дождь они чувствуют не выходя из дому: ремонтируемая крыша текла полгода. Теперь жильцы разбираются с последствиями «большого потопа».**

ДЕЛО в том, что в апреле текущего года в доме № 117, к. 2, по ул. Маяковского начался плановый капитальный ремонт. Вот тогда и начались проблемы у жильцов дома. Людмила Пшигоцкая, она живёт на пятом этаже первого подъезда дома, рассказала о полугодовом страдании её и многих других семей ремонтируемого дома:

– Уже через неделю после начала ремонта нашу квартиру затопило. И 8 апреля я вызвала ЖРЭО для составления акта о затоплении. Но после этого вода с потолка текла всякий раз, когда шёл дождь. Ни жалобы в ЖРЭО, ни звонки в Госнадзор ничего не дали. Последнее затопление было в начале сентября. Работники ЖРЭО почему-то в тот раз вообще не пришли для составления акта.

Результат «водных баталий» – постоянно сырые стены, испорченные обои, покосившийся косяк входной двери, разбухшей из-за постоянной сырости.

Вот что ответила «АиФ» **начальник отдела капитального ремонта ЖРЭО Ленинского района Татьяна СТАИНА:**

– ПРИ капитальном ремонте данного дома ЖРЭО Ленинского района выступает как заказчик. Подрядчик же – УП «Минскремстрой». С них и надо спрашивать. Я же не виновата, что они не могут нанять организацию, которая сделала бы этот ремонт...

Что же до возмещения ущерба, то, по словам Татьяны Стаиной, всем жильцам дома в рамках капитального ремонта отделочные работы будут выполнены бесплатно. Вот тут-то и загвоздка. Дело в том, что при таком ремонте используются только белорусские материалы. Если же жильцы желают использовать свои обои и краску, то они должны отказаться от услуг ЖРЭО.

Компенсация в таком случае не предусмотрена...

* * *

Неўзабаве пасля публікацыі гэтага матэрыялу з ЖРЭА Ленінскага раёна г. Мінска на адрас рэдакцыі прыйшло тлумачэнне прычын затаплення. У тым жа лісце начальнік ЖРЭА паведаміў, што дах у доме ўжо зроблены.

Прыведзеныя аўтарскія матэрыялы паказваюць, што беларуская частка «АиФ» адрозніваецца ад расійскай тым, што ў расійскай друкуецца ў асноўным аналітыка падзеяў, каментары па агульнапалітычных, агульнаэканамічных пытаннях, матэрыялы аўтарытэтных калумністаў – з аднаго боку, а з другога – пазнавальныя матэрыялы агульнага інтарэсу, парады па здароўі, сельскай гаспадарцы, паляванні, доглядзе аўтамабіля і інш. Матэрыялы ж сацыяльна-эканамічнай тэматыкі беларускай рэдакцыі «АиФ» маюць практычна-асветніцкі характар. Тут друкуецца шмат навін пра новыя законы, пастаянна выходзіць калонка юрыста, асвятляюцца пытанні датычна карыстання нерухомасцю, жыллёва-камунальнымі паслугамі, праз газету чытачы вырашаюць свае побытавыя праблемы,

звязаныя з абаронай правоў пакупнікоў, выкананнем дзяржавай сацыяльных гарантый перад грамадзянамі. І пры гэтым амаль адсутнічае аналітыка палітычных падзей, няма той рэпартажнасці, якая прысутнічае ў расійскай частцы. На маю думку, гэтыя **розныя кантэнты – беларускі і расійскі – дапаўняюць адзін аднаго.** У меншай ступені беларускаму чытачу цікавыя адказы на прыватныя пытанні расійскіх чытачоў. У расійска-беларускай газеце чытач атрымлівае аналітыку расійскіх журналістаў і парады ў вырашэнні надзённых праблем сваіх грамадзян ад беларускіх журналістаў.

**Высновы.** Сацыяльная сфера сама па сабе надзвычай шматгранная. Наша выданне імкнецца, каб як мага аператыўней пранікнуцца праблемамі чытача, якія ўзнікаюць ва ўсіх галінах сацыяльнай сферы. Мяркуючы па праблемах, якія ўздымаюцца ў аўтарскіх матэрыялах, сацыяльная сфера ў краіне мусіць тэрмінова рэфармавацца. Ёсць пэўныя поспехі, але відавочныя і шматлікія недахопы ў функцыянаванні асобных галін сацыяльнай сферы, на выпраўленне якіх дзяржава павінна павялічваць фінансаванне, а таксама праводзіць рэформы з удзелам грамадскасці. Аўтарскія матэрыялы выклікаюць зваротную сувязь з боку службовых асоб, адказных за пралікі свайго ведамства. Найбольшая колькасць аўтарскіх матэрыялаў, якія даследаваліся ў працы, на тэму ЖКГ – 14,2 % і адукацыі – 7,14 %. Гэтыя тэмы актуалізуюцца ў першую чаргу чытачамі. Рэдакцыя лічыць неабходным не пакідаць пытанні без адказу, і я, як аўтар, стараюся па магчымасці адказваць на гэтыя пытанні.

* * *

Чытачу можа падацца, што зашмат месца адведзена пытанню ўкаранення аўтарскіх публікацый у тэкст дыпломнай работы. Дастаткова было б двух-трох узораў. Прызнаю́ся, што мне ўвесь час карцела данесці да шаноўных выпускнікоў узровень журналісцкага майстэрства нашага студэнта, яго творчы прафесіяналізм і здольнасці наладзіць трывалую і, галоўнае, **выніковую** сувязь паміж газетай, чытачом і ўладнымі структурамі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

«АиФ в Белоруссии» – спецыфічнае грамадска-палітычнае выданне, вялікая частка матэрыялаў у якім адведзена пад сацыяльна-эканамічную праблематыку. Перад журналістамі «АиФ» стаіць

задача не проста перадаваць інфармацыю, не толькі аналізаваць яе і шукаць каментары кампетэнтных асоб, але і даваць канкрэтныя парады чытачу, адказваючы на ягонае прыватнае пытанне, якое можа тычыцца і шырокага кола людзей. Як і трыццаць гадоў таму, газета вучыць чытача, а чытач – газету, скіроўваючы рэдакцыю на асвятленне не толькі надзённых, але і глабальных праблем.

Найбольш папулярныя тэмы штотыднёвіка палягаюць у сацыяльнай сферы: вырашэнне жыллёвай праблемы, жыллёва-камунальная гаспадарка, памер пенсіі, адмененыя льготы, здароўе, правы замежнікаў у Беларусі, зямельныя пытанні, савецкія ўклады, крэдытаванне і інш. Меркаваць пра гэта можна зыходзячы з лістоў і тэлефонных званкоў чытачоў, якія потым знаходзяць адлюстраванне на старонках газеты. У прыватнасці ў маіх, аўтарскіх, матэрыялах больш за ўсё – тэмы ЖКГ (14,2 % ад разгледжаных у працы матэрыялаў) і жыллёвага будаўніцтва (7,14 %), якія адносяцца як да сацыяльнай, так і да эканамічнай сферы. Часцей за ўсё жанр такіх матэрыялаў – спецыфічны для «АиФ» «пытанне – адказ». Нават артыкулы і карэспандэнцыі, прадстаўленыя ў штотыднёвіку, арыентаваныя на зразумелае для чытачоў тлумачэнне праблемы. Галоўнае, каб чытач мог вынесці карысную для сябе інфармацыю. Аб'ём «пытання – адказу» пераважна невялікі: адзін нумар «АиФ» можа змяшчаць да 20 матэрыялаў гэтага жанру. Норма, якую ставіць рэдакцыя для аднаго журналіста, – 3–5 адказаў на чытацкія пытанні ў нумар. Гэта можа быць афіцыйны адказ з дзяржаўнай установы ці каментар эксперта. Галоўнае, каб на старонках газеты быў надрукаваны такі адказ, які б не выклікаў чарговых пытанняў.

Аўтарскія матэрыялы, якія складаюць творчую частку маёй дыпломнай работы, тэматычна і зместава адпавядаюць дзяржаўнай палітыцы ў галіне эканомікі, маюць сацыяльную арыентацыю. Многія аўтарскія матэрыялы выклікалі станоўчую рэакцыю з боку ўладных структур, тым самым паўплываўшы на практычнае вырашэнне праблем.

Некаторыя матэрыялы даюць адказ на пэўнае пытанне, некаторыя – уздымаюць праблему, пра якую не згадваюць іншыя СМІ і якая выпала з-пад увагі дзяржаўных органаў. Так, тэма абменнага курсу беларускага рубля за мяжой раней у СМІ не ўзгадвалася. Але пасля пытання выдання ўдалося прыцягнуць увагу Нацыянальнага банка да праблемы, прэс-сакратар якога ў інтэрв'ю «АиФ» выказаў заклапочанасць гэтым пытаннем.

Самай вострай сацыяльнай тэмай у маіх матэрыялах з'яўляецца тэма жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якая тычыцца кожнага

грамадзяніна Беларусі. Запыты, скаргі чытачоў, інтэрв'ю, пытанні на прэс-канферэнцыях, аўтарскія публікацыі ў газеце – так актуалізуецца тэма рэфармавання сістэмы ЖКГ, пераўтварэння яе ў празрыстую структуру. Пасля ўдзелу «АиФ» у семінары па развіцці сістэмы ЖКГ узнікла ідэя арганізаваць круглы стол у прэс-цэнтры выдання, дзе прадстаўнікі дзяржаўных органаў і грамадскасці маглі б абмеркаваць праблемы галіны. Гэта стала магчымым дзякуючы пастаяннай увазе газеты да дзейнасці галіны. Дзякуючы адказам праз газету многія чытачы змаглі напрамую вырашыць свае праблемы, пра што сведчаць званкі з удзячнасцю рэдакцыі. Уласны вопыт працы ў «АиФ» на працягу двух гадоў мне дазволіў выбраць тэму, звязаную з такім аўтарытэтным для Беларусі выданнем, і паглядзець на сваю творчасць скрозь прызму сацыяльна-эканамічнай тэорыі. Сацыяльна-эканамічны стан Беларусі, палітыка, адлюстраваныя на старонках маёй дыпломнай работы, – гэта тэарэтычны бэкграўнд (фон), які падсвечвае маю творчую дзейнасць.

У Беларусі яшчэ шмат нявырашаных праблем і недасканаласцей як у эканоміцы, так і ў сацыяльнай сферы. А таму пытанні ад чытачоў на адрас рэдакцыі яшчэ будуць.

У той жа час з-за вялікай увагі беларускай рэдакцыі да «пытанняў – адказаў» вострыя аналітычныя матэрыялы, падобныя тым, што змешчаны ў расійскай частцы, адсоўваюцца на другі план. Таму мая наступная творчая прыступка – гэта аналітыка: балазе, што журналісцкая школа аналітыкі ёсць на старонках расійскай часткі нашага выдання.

* * *

Аўтарскія матэрыялы ў творчай дыпломнай рабоце «Сэнсаўтваральная структура інфармацыйных праграм "Радыёфакт" і "Пастфактум"» (2010 год, фрагменты з гл. 3).

### Глава 3 Аўтарскія матэрыялы ў сэнсаўтваральнай структуры праграм «Радыёфакт», «Пастфактум»

Пракуратура для жыхароў нашай краіны застаецца той інстанцыяй, якая здольна кампетэнтна і аб'ектыўна разабрацца ў сітуацыі, хутка прыняць неабходныя меры па абароне парушаных правоў. Генеральная пракуратура Беларусі адзначае павелічэнне колькасці зваротаў грамадзян. За мінулы год паступіла каля 75 тысяч зваротаў. Матэрыялы пракурорскага нагляду сведчаць пра парушэнні заканадаўства ў дзейнасці мясцовых выканаўчых

і распарадчых органаў улады. Калегіі Генеральнай пракуратуры Беларусі, на якіх абмяркоўваюцца пытанні абароны правоў грамадзян, асвятляюцца ў праграме «Пастфактум».

***Вядучы (студыя):*** *Генеральная пракуратура Беларусі падрыхтавала прапановы па паляпшэнні жыллёвых умоў дзяцей з ліку сірот. Існуе шэраг праблем у рэалізацыі правоў гэтай катэгорыі грамадзян. Недастатковае прававое рэгуляванне на месцах, хібы ў арганізацыі работы па забеспячэнні паўналетніх з ліку сірот жыллём.*

***Расказвае Ірына Грыгаран.***

*У нашай краіне больш за 35 тысяч дзяцей-сірот. Дзейнічаюць меры дзяржаўнай падтрымкі гэтай катэгорыі грамадзян у галіне жыллёвага забеспячэння. Перш за ўсё – пазачарговае атрыманне жылля. Генеральная пракуратура Беларусі правяла шэраг праверак, наколькі эфектыўна рэалізуюцца жыллёвыя правы дзяцей з ліку сірот.*

*Як адзначала начальнік аддзела па справах непаўналетніх і моладзі Генеральнай пракуратуры Дар'я Лебедзева, існуе шэраг праблем.*

***Сінхр.***

*[28.04.10. Пастфактум]*

***Вядучы (студыя):*** *У мінулым годзе ўпраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі па Мінску і Мінскай вобласці праведзена больш за тысячу праверак. Сума прад'яўленых да ўплаты падаткаў і адміністрацыйных спагнанняў склала каля ста дзесяці мільярдаў беларускіх рублёў.*

*Асноўныя накірункі аператыўна-службовай дзейнасці ўпраўлення – выяўленне правапарушэнняў у галінах аўтабізнесу, банкаўскай справы, прадпрымальніцтва, у перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, будаўніцтве, знешнеэканамічнай дзейнасці; барацьба з карупцыяй.*

***Расказвае Ірына Грыгаран.***

*Каля 350 крымінальных спраў узбуджана ў мінулым годзе па выніках праверак упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі па Мінску і Мінскай вобласці.*

*«Сорак сем працэнтаў ад агульнай колькасці злачынстваў складаюць цяжкія і асабліва цяжкія», – расказвае намеснік начальніка ўпраўлення па ідэалагічнай і кадравай рабоце Сяргей Пракаповіч.*

***Сінхр.***

*[18.02.10. Пастфактум]*

Да ўвагі грамадзян краіны – дзейнасць Дзяржаўтаінспекцыі. Мы прывыклі бачыць у супрацоўніках ДАІ ў першую чаргу людзей, якія могуць пакараць за невыкананне правілаў дарожнага руху. Але праца гэтага кантралюючага органа на тым не канчаецца. Задача СМІ – асвятляць дзейнасць Дзяржаўтаінспекцыі з розных бакоў.

***Вядучы (студыя):*** *Новы філіял рэгістрацыйнага падраздзялення Дзяржаўтаінспекцыі па горадзе Мінску адкрыўся ў сталіцы. Сучасная аўтаматызаваная сістэма кіравання патокамі грамадзян дазваляе больш якасна і хутка аказваць паслугі, звязаныя з рэгістрацыяй і зняццем з уліку механічных транспартных сродкаў.*

***Расказвае Ірына Грыгаран.***

*Новы філіял агульнай плошчай больш за тысячу квадратных метраў знаходзіцца на тэрыторыі гандлёвага дома «Ждановічы». Аўтаматызаваная сістэма дазваляе праводзіць каля пяцісот аперацый у дзень. Работа, у якой задзейнічаны ўсяго 25 супрацоўнікаў, арганізавана па прынцыпе «Адно акно». Спецыяльныя камп'ютарныя тэрміналы фарміруюць электронную чаргу. Такім чынам, з моманту падачы дакументаў да пачатку іх апрацоўкі праходзіць некалькі секунд. Увесь працэс атрымання рэгістрацыйных нумароў і афармлення дакументаў займае гадзіну.*

*«Тут жа можна застрахаваць свой аўтамабіль, прайсці тэхнічны агляд», – расказвае намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Максім Падбярозкін.*

***Сінхр.***

*[12.03.10. Пастфактум]*

* * *

Тэкставыя фрагменты глаў, пазначаныя фразай ***«Расказвае Ірына Грыгаран»***, г. зн. аўтар дыпломнай работы, залічваюцца ў аўтарскія матэрыялы і складаюць творчую частку дыпломнай работы па радыёжурналістыцы.

## ВОДГУК І РЭЦЭНЗІЯ

Абодва жанры скіраваны на аналіз дыпломнага даследавання ў яго навукова-тэарэтычнай і практычнай значнасці, на абгрунтаванне выстаўленай па дзесяцібальнай сістэме ацэнкі навуковым кіраўніком і

рэцэнзентам. Зместавым накірункам для напісання водгуку і рэцэнзіі з'яўляюцца распрацаваныя намі з улікам усебаковых патрабаванняў да дыпломнай работы крытэрыі яе ацэнкі (гл. с. 89–93). Практыка напісання і водгуку, і рэцэнзіі на дыпломную работу часта сведчыць, што шэраг слушных патрабаванняў, праігнараваных дыпломнікам, застаюцца па-за ўвагай навуковага кіраўніка і рэцэнзента. Як правіла, гэта якасць даведачнага апарату і, на жаль, моўна-стылёвы ўзровень дыпломнага даследавання. Суб'ектыўная ацэнка часта даецца творчай дыпломнай рабоце – не ўлічваюцца якасныя і колькасныя патрабаванні да аўтарскіх матэрыялаў. Адсюль і неаб'ектыўны ацэначны бал, выстаўлены за работу.

Пры ўсім сваяцтве адзначаных ацэначных жанраў рэцэнзія абавязвае яе аўтара да болей глыбокага аналізу дыпломнай работы, да абгрунтавання навукова-практычнай вартасці высноў, да вызначэння іх ролі ў развіцці сучаснай медыясферы. Карацей кажучы, калі водгук навуковага кіраўніка можа месціцца на паўтары старонкі, дык рэцэнзія патрабуе не меней як дзвюх старонак друкаванага тэксту.

Водгук[1]
на дыпломную работу «Сацыяльна-эканамічная праблематыка ў штотыднёвіку "Аргументы и факты в Белоруссии" (творчая работа)» студэнта 5-га курса Трафімовіча Антона Анатольевіча

Аўтар дыпломнага даследавання сваё навучанне на факультэце журналістыкі сумяшчае з працай у беларускай рэдакцыі расійскага выдання «Аргументы и факты в Белоруссии» – шматтыражнага, аўтарытэтнага, папулярнага. Малады журналіст адразу зарыентаваўся ў творчым накірунку выдання, «сакрэтнай зброяй» якога, зазначае галоўны рэдактар М. Зяцькоў, з'яўляецца «активное, искреннее и творческое участие наших читателей в формировании каждого номера». Дамінуючымі ў чытацкіх інтарэсах з'яўляюцца пытанні сацыяльнай тэматыкі і эканамічнай, падкрэсліў галоўны рэдактар.

Менавіта сацыяльна-эканамічная дамінанта працінае ўсю творчую частку работы журналіста-дыпломніка, якая і ў колькасным, і ў зместавым выражэнні цалкам адпавядае патрабаванням да творчай дыпломнай работы. Аўтару ўдалося стварыць дастатковую тэарэтычную базу, якая паслужыла падставай для абгрунтавання актуальнасці тэматыкі аўтарскіх матэрыялаў, іх сэнсавай

[1] Тэкст водгуку не прэтэндуе на ўзорны.

вартасці і для вызначэння іх ролі ў рэалізацыі ўрадавых сацыяльна-эканамічных праграм Беларусі. У аўтарскіх матэрыялах адлюстраваныя, адпаведна іх жанрам, шматлікія нашыя жыццёвыя праблемы і клопаты (жыллёвае будаўніцтва; беспрацоўе; энергарэсурсы; нафта; газ; інвестыцыі; здароўе; адукацыя і інш.). Да ўдзелу ў камунікацыі з чытачамі запрашаюцца аўтарытэтныя асобы, высокапрафесійныя эксперты – і ўсё гэта працуе на імідж выдання і на забеспячэнне дабрабыту беларусаў.

Варта адзначыць творчую якасць аўтарскіх тэкстаў, адзінства зместу з літаратурнай формай (належныя загалоўкі, граматныя ліды, пераканаўчая інфарматыўнасць). У рабоце дастатковы і навуковы апарат.

Аўтар дыпломнай работы добра валодае абедзвюма дзяржаўнымі мовамі. Работа пісьменная. Афармлена паводле Дзяржстандарту. Менавіта такога ўзроўню дыпломныя работы могуць намінавацца творчымі. Творчая частка дыпломнай работы Антона Трафімовіча ацэньваецца мною балам «10». Гэтым жа балам ацэньваецца і дыпломнае даследаванне ў цэлым.

Навуковы кіраўнік –
канд. філал. навук дацэнт М. П. Карповіч
04.06.2010 г.

# Частка III | МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ СУЧАСНАЙ МЕДЫЯСФЕРЫ

## МЕТАД – ПЕРШААСНОВА ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Прафесійныя набыткі даследчыка медыясферы базіруюцца на *тэорыі масавай камунікацыі, масавай інфармацыі, на метадалагічных прынцыпах навуковага аналізу СМІ, на глыбокім асэнсаванні аб'екта даследавання, прадмета і тэмы* – сегмента прадмета даследавання. Першаасновай навуковай творчасці, як і любога віду дзейнасці, з'яўляецца метад (ст.-грэч. – спосаб даследавання). «Ён вызначае асноўныя прынцыпы дасягнення мэты ў пэўнай грамадскай сферы, найболей эфектыўныя спосабы вырашэння канкрэтнай задачы, аб'ядноўвае комплекс прыёмаў практычнага ці тэарэтычнага асэнсавання (спазнання) і ўдасканалення навакольнага свету» – такія функцыянальныя асаблівасці метаду адзначае прафесар Б. В. Стральцоў [118, с. 50]. **Метад** – гэта сукупнасць пэўных правілаў, прыёмаў, спосабаў, нормаў пазнання і дзеяння; гэта сістэма прадпісанняў, прынцыпаў, патрабаванняў, якія павінны арыентаваць даследчыка ў вырашэнні канкрэтнай задачы, у дасягненні пэўнага выніку ў той ці іншай сферы дзейнасці.

У даследчай метадалогіі мае месца класіфікацыя метадаў, аб'яднанне іх у пэўныя групы на падставе характару даследавання, яго мэты. Вылучаюць, да прыкладу, агульнанавуковыя метады (дэдукцыі, індукцыі, сінтэзу); аналітычныя, структурныя, сістэмныя метады; прыкладныя метады (эксперыментальны, супастаўляльны, апісальны, дапаўняльны, кантэнт-аналітычны); метады даследавання прыватных («частных») навук (напрыклад, у даследаванні тэорыі камунікацыі і інфармацыі – гэта метады інтэрактыўнасці: інтэрв'юіравання, фокус-груп і інш.).

«Метад дысцыплінуе пошук ісціны, дапамагае набліжацца да мэты найкарацейшым шляхам», – зазначае даследчык В. П. Каханоўскі ў сваёй кнізе «Философия и методология науки» [цыт. па: 57, с. 123].

## КАНТЭНТ-АНАЛІЗ ЯК АБ'ЕКТЫЎНЫ МЕТАД НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Менавіта як «сістэму прадпісанняў» апошнім часам вучоныя (расійскія, украінскія) бачаць папулярны метад навуковага даследавання сучасных СМІ – ***метад кантэнт-аналізу***, інакш – *кантэнт-аналітычны аналіз* СМІ, які ў нашай даследчай рэчаіснасці ўзгадваецца часта, але па сутнасці сваёй далёкі ад тых шматлікіх методык, якія дазваляюць рэалізаваць даследчы патэнцыял метаду кантэнт-аналізу. Прывяду некаторыя пункты гледжання вучоных на ролю гэтага метаду. На сучасным этапе развіцця грамадства, разважае вядомы ўкраінскі вучоны, доктар філалагічных навук, прафесар В. Ф. Іваноў, журналістам крайне неабходныя веды пра *аб'ектыўныя* метады даследавання, каб вынікі вывучэння прадмета не арыентаваліся на пэўныя погляды даследчыка, а ўяўлялі сабой незалежны, аб'ектыўны аналіз. Пад агульнай рэдакцыяй прафесара В. Ф. Іванова ў 1999 годзе выйшаў аб'ёмісты падручнік для студэнтаў інстытутаў і факультэтаў журналістыкі [114]. «Именно поэтому, – лічыць В. Ф. Іваноў, – следует обратиться к такому методу, как контент-анализ. К сожалению, этот широко распространённый за границей метод был недостаточно развит в Украине. Определяющей чертой и главной ценностью контент-анализа и является его научная объективность и строгость. То есть при исследовании одного и того же предмета с использованием одних и тех же категорий анализа все исследователи, независимо от своих научных и политических взглядов, получают одинаковые результаты. Это даёт возможность делать действительно объективные исследования и служит определённой гарантией того, что нам не придётся каждые 20–30 лет переделывать исторические, социологические исследования и учебники под влиянием новых политических ориентаций» [Тамсама, с. 88]. (У ЗША толькі за 1900–1958 гады было апублікавана амаль 1700 навуковых прац па кантэнт-аналізе, прычым 500 з іх – дысертацыйныя даследаванні.) Існуючыя навуковыя распрацоўкі ўжо не задавальняюць, бо новыя рэаліі патрабуюць новых падыходаў. Перагляд існуючых тэорый, іх мадэрнізацыя ў сувязі з абнаўленнем навуковых ведаў заканамерныя, разважае прафесар В. Ф. Іваноў [Тамсама, с. 90].

Што датычыць папулярнага метаду кантэнт-аналізу, дык у нашай даследчай практыцы ён не знаходзіць рэалізацыі сваіх магчымасцей.

І гэта яскрава пацвярджаюць сёння расійскія вучоныя. Доктар філалагічных навук прафесар А. Р. Самарцаў адзначае ў сваёй кнізе (2009) фрагментарнасць у выкарыстанні намі заходніх методык стагадовай даўніны, якія і сёння запатрабаваныя ў медыясферы [гл.: 100, с. 10].

Дастаткова сказаць, што ў даследчую практыку ЗША ў сувязі з патрэбамі журналістыкі яшчэ ў 80-я гады XIX стагоддзя быў уведзены *кантэнт-аналіз* і з таго часу ён стаў, адзначае даследчык М. М. Назараў, «неотъемлемым элементом совершенствования редакционной политики. Причём по мере распространения контент-анализа всё больше внимания уделялось методике исследования, прежде всего вопросам совершенствования критериев классификации текстов» [74, с. 122].

Для нас кантэнт-аналіз, нягледзячы на частае ўзгадванне яго ў нашых навуковых тэкстах, дагэтуль «метадалагічная загадка, якую кожны разгадвае па-свойму».

Лічу мэтазгодным даслаць вас, шаноўныя чытачы, да выданняў «Современная журналистика» [114]; «Массовая коммуникация в современном мире: методология анализа и практика исследований» [74], «Социология журналистики» [37, с. 77–92], каб унікнуць у сутнасць кантэнт-аналітычнага аналізу і, асэнсаваўшы яго методыкі, пайсці далей, улічваючы час і эпоху. Менавіта такой даследчай пазіцыяй у галіне журналістыкі я магу патлумачыць сваю, можа і залішнюю, «трансляцыю» поглядаў вучоных на метад кантэнт-аналізу як аб'ектыўны метад, што пацвярджаюць даследаванні ў сістэме амерыканскіх СМІ.

## МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ЗМЕСТУ

Цэнтральнае месца ў СМІ займае **змест** паведамленняў, які звязвае крыніцу інфармацыі – камунікатара з рэцыпіентам (аўдыторыяй). Існуе шэраг метадаў вывучэння зместу, падзеленых на 2 групы: *класічныя* (*традыцыйныя*) *метады* аналізу і *фармалізаваны метад* – кантэнт-аналіз. Іх аб'ядноўваюць аб'ект даследавання і мэты даследавання. Раз'ядноўвае іх тое, што традыцыйныя метады лічацца *якаснымі* («качественными»), а кантэнт-аналіз – *колькасным*. Хаця апошні сёння ўжо лічыцца колькасна-якасным, а ў класічных метадах назіраецца

разнастайная «квантыфікацыя» – колькаснае выражэнне (вымярэнне) якасных прымет.

Традыцыйныя метады даследавання зместу публікацый – гэта, да прыкладу, *гістарычны метад* (дапамагае па розных прыметах дакумента (твора) раскрыць новыя старонкі гісторыі); *біяграфічны метад* (даследуюцца розныя матэрыялы, не толькі біяграфічныя, каб даследаваць развіццё грамадства, жыццёвы шлях чалавека). Апошнім часам вучоныя разам з біяграфічным метадам дадаткова выкарыстоўваюць і *метад кантэнт-аналізу*. Самым вядомым даследаваннем, праведзеным біяграфічным метадам з прыцягненнем кантэнт-аналізу, лічыцца праца У. Томаса і Ф. Знанецкага «Польский крестьянин в Европе и Америке». Аўтары гэтай працы, якая стала класічнай, распавядае прафесар В. Ф. Іваноў, вырашылі даследаваць, з якімі праблемамі сутыкнуліся маламаёмасныя польскія сяляне ў Амерыцы. Яны вывучылі 8 тысяч нумароў газеты спецыяльнага перыядычнага выдання польскіх эмігрантаў у ЗША за 20 гадоў, картатэку і афіцыйныя дакументы Саюза дабрачыннасці, які дапамагаў небагатым эмігрантам, а таксама царкоўных прыходаў. Аўтары прыцягнулі для атрымання неабходных звестак грашовыя ўзнагароды: за сімвалічную плату (10–20 цэнтаў за ліст) яны атрымалі 754 лісты (50 камплектаў) ад польскіх эмігрантаў, за плату быў складзены жыццяпіс (500 старонак) польскага селяніна Уладака Віхноўскага, які эміграваў у Амерыку. Разумеецца, адзначае В. Ф. Іваноў, у гэтага даследавання былі не толькі прыхільнікі, але і праціўнікі. Напрыклад, амерыканскі даследчык Х. Блумер, крытыкуючы працу У. Томаса і Ф. Знанецкага, лічыў, што назбіраны імі матэрыял цалкам ілюстрацыйны і таму на яго падставе нельга рабіць высновы [114, с. 116]. Гэты прыклад нас пераконвае, якія строгія патрабаванні выстаўляюцца да метаду даследаванняў.

Сярод класічных метадаў вылучаюць такія, як *літаратурны метад* (з яго дапамогай вызначаецца індывідуальнасць аўтара твора); *лінгвістычны метад* (скіраваны не столькі на змест, колькі на частотнасць пэўных лінгвістычных адзінак, а таму падобны да метаду кантэнт-аналізу). Апроч пералічаных, існуюць *метады псіхалагічны*, *юрыдычны*, *сацыялагічны* ў класічным аналізе дакументаў. У цэлым усе *класічныя* метады падобныя. Яны дапамагаюць, захоўваючы арыгінальныя рысы дакумента, глыбока ўнікнуць у яго сутнасць. Але пры ўсім гэтым даследчыкі не прамінуць падкрэсліць, што гэтыя

метады *суб'ектыўныя* і «могут свести на смарку весь труд исследователя в глазах людей с другими взглядами и подходами к рассматриваемой проблеме». Высновы даследавання больш аб'ектыўнымі і пераканальнымі дазваляе зрабіць *фармалізаваны* метад вывучэння дакумента – *кантэнт-аналіз*. «Пальма первенства как по количеству, так и по качеству использования контент-анализа, бесспорно, принадлежит американцам». «Впервые на американском континенте *формализованный* анализ **содержания** (вылучана намі. – *М. К.*) применил Д. Спид, напечатав в 1893 г. статью "Дают ли сейчас газеты новости?". Исследование было связано с тем, что незадолго до этого "Нью-Йорк Таймс" значительно увеличила свой тираж благодаря снижению цены за экземпляр с 3 до 2 центов и одновременно увеличила объём номеров. Другие газеты, чтобы как-то удержаться на плаву, вынуждены были пойти тем же путём. Д. Спид с помощью контент-анализа показал, что изменения в газетах стали не только количественными, но и качественными. Он классифицировал воскресные выпуски нью-йоркских газет за 1871–1883 гг. по темам, подсчитал объём материалов по каждой теме в дюймах (расійская адзінка – 10 ліній, альбо 2,54 см; англійская – 1/12 фута, альбо 0,0254 м. – *М. К.*) и сравнивал цифры. Оказалось, что за 12 лет нью-йоркские газеты начали значительно меньше уделять внимания таким темам, как литература, политика, религия, однако увеличилась площадь, предоставленная на газетных полосах разным сплетням и скандалам. Следующим исследованием в области контент-анализа, ставшим очень известным, была работа Д. Уилкокса. Он проанализировал содержание 240 ежедневных американских газет одного дня. Исследователь классифицировал тематику по следующим пунктам:

1) новости: а) военные; б) общие: международные, политические, преступления, разное;

2) иллюстрации;

3) литература;

4) мнения (редакционные статьи, письма);

5) реклама.

Особенно следует отметить тот факт, что почти все американские исследователи уделяют большое внимание изучению того, насколько *объективная* та или иная газета, не являются ли ее материалы *предвзятыми*» [114, с. 117–119].

Украінскі вучоны В. Ф. Іваноў – матэрыялы якога даводзіцца нам шырока выкарыстоўваць, спасылаецца ў сваім даследаванні на досвед, атрыманы ім падчас замежных камандзіровак і пры аналізе працэсаў, якія адбываліся ў краінах Захаду, супастаўляючы заходнія тэорыі масавай камунікацыі з айчыннымі, адзначаючы ў іх нямала агульнага і нямала адрознага. Кніга «Современная журналистика» была выдадзена ў 1999 годзе. За 11 гадоў адбылося шмат перамен і ў беларускай, і ва ўкраінскай, і ў расійскай медыясферах.

Датычна агульнай метадалогіі масавай камунікацыі вылучаюць 2 метады: *метад канстатацыі* і *метад інтэрпрэтацыі*. Сутнасць першага – у фіксацыі фактаў, падзей, сітуацый і інш.; сутнасць другога – у аналізе, тлумачэнні, супастаўленні, ацэнцы, сінтэзе, раскрыцці сэнсу «аб'ектаў адлюстравання» [118, с. 51]. Абодва метады па сваёй сутнасці прыдатныя для навуковых даследаванняў, у тым ліку і для дыпломнага даследавання ў сферы журналістыкі.

Існуе шэраг *методык* збору інфармацыі для выканання дыпломнай работы. У аснове сваёй яны ўжо знаёмыя выпускнікам інстытута як метады збору інфармацыі пры напісанні тэкстаў для СМІ. Гэта *група камунікатыўных метадаў* – непасрэдных ці апасродкаваных зносін (інтэрв'ю, розныя спосабы апытання, запыт («запрос») інфармацыі); *група некамунікатыўных метадаў* (праца з дакументамі, рэдакцыйнымі архівамі; навуковымі крыніцамі); *група сінтэтычных* (сінтэз інфармацыі) *метадаў*, інакш – *аналітычных* (прагнозы на падставе тэорыі як праверанай і даказанай сістэмы поглядаў) [гл.: 100, с. 69–116].

Тэма, якую пастаянна асвятляе журналіст у СМІ, можа стаць прадметам навуковага аналізу. Пра тое, як журналісты выходзяць на сваю тэму, можна пачуць ад іх саміх: «Один из источников информации – всевозможные брифинги, пресс-конференции в пресс-центрах МВД, МИД и т. д., – сообщает редактор отдела новостей, хроники и экстремальных ситуаций газеты "Рабочая трибуна". – Слава богу, сейчас в каждом ведомстве есть люди, отвечающие за связи с прессой. Массу любопытной информации получаешь, побывав там. И любой факт может стать поводом для журналистского исследования – бери, копай, пиши. Но …ловлю себя на том, что *боюсь принимать на веру сведения из самых, казалось бы, надёжных источников»* [57, с. 111].

Вылучаная мною фраза – галоўная перасцярога як для аўтараў публіцыстычнага тэксту, так і для аўтараў тэксту навуковага. І яшчэ адна перасцярога: навуковы твор адрозны ад публіцыстычнага як па характары інфармацыі, чытацкім адрасе, так і па стылі. Гэта трэба мець на ўвазе пры напісанні дыпломнай работы, каб не збівацца на публіцыстычны стыль у выкладзе навуковай інфармацыі, а ўвесь час трымацца навуковага стылю, узорам якога з'яўляюцца навуковыя крыніцы. Маё папярэджанне не беспадстаўнае: менавіта дыпломнікам-журналістам уласціва перавага публіцыстычнага стылю над навуковым у тэксце дыпломнага даследавання. Навуковыя кіраўнікі гэта заўважаюць і з гэтым змагаюцца.

# Частка IV. ТЭРМІНАСФЕРА МАСМЕДЫЙНЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

У дэкадзіраваным варыянце тэрмінасфера – гэта тэрміналагічная сістэма, абмежаваная адной галіной навукі. Тэрмін (ад лац. terminus – мяжа, «предел») – слова, якое ўжываецца для абазначэння пэўнага паняцця з адценнем спецыяльнага навуковага значэння. Сістэма тэрмінаў звычайна называецца тэрміналогіяй.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ

Улічваючы спецыфічную функцыю СМІ – служыць грамадскім інтарэсам, вучоныя вылучаюць ***тэрміналогію*** двух відаў (тыпаў): *грамадска-палітычную* – тэрміны, якія абслугоўваюць грамадска-палітычную галіну інтарэсаў, канцэптуалізуюць адпаведную карціну свету, сацыяльна-палітычную рэчаіснасць, адлюстроўваюць масавую свядомасць і інш.; і *спецыяльную тэрміналогію* як асобы спосаб рэпрэзентацыі спецыяльнага досведу, спецыяльных ведаў [гл.: 20, с. 20]. (Рэпрэзентацыя – фр. représentation – прадстаўніцтва.) Спецыяльныя тэрміны з'яўляюцца носьбітамі і ахоўнікамі інфармацыі, важнай у паняццевай сістэме адпаведных навуковых інтарэсаў. Для нашага дыпломнага даследавання маюць аднолькава важнае значэнне абедзве тэрмінасферы – грамадска-палітычная і спецыяльная. Прывяду прыклад. Журналістка гутарыць з народным артыстам Расіі, мастацкім кіраўніком тэатра «Содружество актеров Таганки», намеснікам старшыні Маскоўскай гарадской думы Мікалаем Губенкам:

– Николай Николаевич, своей «Ареной жизни» вы «наехали» на всех власть имущих. Это вызов? Хотя постановка заявлена в афишах как феерическая театрально-цирковая мистерия, ваш новый спектакль многие считают политическим.

– Нет, он исторический. Во властных структурах государства Российского за 160 лет – с момента, когда Салтыков-Щедрин написал свое произведение, – почти ничего не изменилось. …Есть народ, который безмолвствует, и власть, которая делает всё, что хочет, пока она у власти. …Я считаю, что настоящая свобода действительно отсутствует. А вот свобода экстремизма во всех сферах нашей жизни, свобода насилия, когда слабый всегда в проигрыше, а сильный бьёт по темени или в лоб стреляет, есть. *Так что я попросил бы не акцентировать, что наш спектакль политический. Слово «политика» сразу отпугивает, вызывает у потенциального зрителя неприязнь* (вылучана намі. – *М. К.*). Политики последних времён часто обманывали людей, в результате чего народ обнищал до изнеможения. И, как говорят у Щедрина персонажи, сейчас за наш рубль полтинник дают, а скоро будут давать по морде (АиФ. 2011. 5 февр. С. 3).

Як сведчыць прыведзены прыклад са сродкаў масавай інфармацыі, грамадска-палітычная тэрміналогія таксама прэтэндуе на прадмет навуковага даследавання. Што датычыць спецыяльнай, масмедыйнай, тэрмінасферы, дык шэраг тэрміналагічных паняццяў дагэтуль застаюцца сэнсава, а значыць і функцыянальна, не размежаванымі. У навуковых даследаваннях падобныя з'явы спараджаюць падмену паняццяў, якая адразу адбіваецца на логіцы навуковага разважання і на выніках даследавання. Часцей за ўсё падмяняюцца паняцці сэнсава блізкія, кшталту: *масавая камунікацыя – масавая інфармацыя*; *інфармацыйная прастора – інфармацыйнае поле*; *метадалогія даследавання – методыка даследавання*; *рэдакцыя – рэдагаванне*; *агульнаўжывальная лексіка – нейтральная* і інш. Апошнім часам назіраецца пэўная терміналагічная недакладнасць, спароджаная «амерыканізацыяй» айчынных СМІ.

Каб не дапусціць у дыпломным даследаванні тэрміналагічных зрухаў, неабходна ў працэсе навуковага аналізу вызначыць сэнсавы аб'ём тэрміна; пазбавіцца ад шматзначнасці ў межах тэрмінасістэмы; сфармуляваць сістэматызуючыя прыметы паняцця, абазначанага тэрмінам. Выкарыстоўваючы тэрмін, трэба добра ўсведамляць, што ён прызначаны для дакладнага выражэння спецыяльнага паняцця і суадносіцца з іншымі тэрмінамі гэтай жа галіны навукі, утвараючы

разам з імі тэрмінасістэму, інакш – тэрмінасферу. У якасці прыкладу прывяду частотны ў даследаванні СМІ лінгвастылістычны тэрмін *канатацыя*, які ў тэрміналагічных слоўніках дэфініруецца наступным чынам: канатацыя (лац. com/con – разам + notare – абазначаць) – дадатковыя семантычныя ці стылістычныя адценні, якія накладваюцца на асноўнае значэнне і надаюць эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку выказванню (урачыстасць, фамільярнасць і інш.) [119, с. 68].

Пры напісанні кандыдацкай дысертацыі мне прыйшлося пашырыць змест паняцця канатацыя і ў тэксце зазначыць наступнае: «У рабоце прынята шырокае тлумачэнне паняццяў *канатацыя, канатацыйная семантыка.* ***Канатацыя*** – гэта эмацыянальна-экспрэсіўная, ацэначная, сацыяльна-гістарычная, асацыятыўная, культуралагічная семы, якія ўтрымліваюцца ў слове. Адна з задач даследавання – вызначыць ролю словаўтваральных сродкаў у фарміраванні канатацыйнага кампанента семантыкі асабовых намінацый і выявіць ступень іх міжмоўнай камунікатыўнай адэкватнасці».

Падобным чынам дзеля празрыстасці навуковага даследавання давялося ўдакладніць сэнс паняццяў *стылістычнае значэнне – стылістычная афарбоўка – стылёвая афарбоўка*; адрозніць паняцце *агульнаўжывальная (міжстылёвая) лексіка* ад паняцця *нейтральная лексіка*, гэта значыць пазбаўленая ацэначнасці, таму і лічыцца нейтральнай. Гэтыя два паняцці – агульнаўжывальная лексіка і нейтральная, дагэтуль у стылістыцы часам лічацца сінонімамі.

Зместавага размежавання патрабуюць ключавыя паняцці нашай даследчай сферы, такія як *масавая камунікацыя* і *масавая інфармацыя*, хаця сродкі іх агульныя: друк, радыё, кіно, тэлебачанне, інтэрнэт. «***Масавая камунікацыя*** – гэта сістэматычнае распаўсюджванне паведамленняў сярод вялікіх, рассяроджаных аўдыторый з мэтай уздзеяння на ацэнкі, меркаванні і паводзіны людзей» – так дэфініруецца паняцце Філасофскім энцыклапедычным слоўнікам (1989) [цыт. па: 20, с. 13]. Схему масавай камунікацыі яшчэ ў 1946 годзе прапанаваў вядомы амерыканскі даследчык Х. Ласвэл.

***Масавая інфармацыя***, маючы ўсёабдымны характар, адначасова з'яўляецца выбіральнай («избирательной») у адносінах да зместу, які дыктуецца ініцыятарам тэксту, аўтарскай інтэнцыяй (намерам). Немалаважную ролю ў масавай інфармацыі выконваюць фонавыя

веды яе атрымальніка – носьбіта пэўнай культуры, члена канкрэтнай дзяржаўна-камунікатыўнай супольнасці. «Фонавыя веды складаюць тую аснову, базіруючыся на якой можна паўплываць на ўспрыманне тэксту рэцыпіентам і/ці на яго паводзіны» [20, с. 13].

«Масавая інфармацыя – інфармацыя, запатрабаваная грамадствам», – так сцісла вызначае гэтае паняцце прафесар А. Р. Самарцаў [100, с. 510].

Як адзначаюць даследчыкі, у апошняе дзесяцігоддзе «навука аб сродках масавай інфармацыі – гэта новы міждысцыплінарны накірунак, які, базуючыся на традыцыйных метадах, прадугледжвае пэўныя змены даследчых акцэнтаў. З пункту гледжання гэтай навукі такія з'явы, як тэатр, літаратура і прэса, адносяцца да традыцыйных, а фатаграфія, кіно, радыё, тэлебачанне, відэа і інтэрнэт – да сучасных сродкаў масавай камунікацыі» [20, с. 14].

## ЗАХОДНЕЖУРНАЛІСЦКАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ Ў АЙЧЫННЫХ СМІ

Шэраг тэрміналагічных пытанняў апошнім часам звязаны з вывучэннем вопыту замежнай журналістыкі, з арыентацыяй на мадэлі заходняй прэсы, на брытанскую мадэль журналістыкі, якая, зазначае доктар філалагічных навук прафесар Я. М. Засурскі, «па праве можа лічыцца адной з самых дасканалых у сусветнай практыцы». Пра гэта яскрава сведчыць прафесар А. Р. Самарцаў у сваёй кнізе «Творческая деятельность журналиста: очерки теории и практики: учеб. пособие; под ред. Я. Н. Засурского» (2009) [100]. Ён піша: «Западная журналистика более столетия пользуется понятиями, которые в отечественной прессе известны фрагментарно, но тем не менее широко используются на практике. Изложение материала в стиле **перевёрнутой пирамиды**, стандартное для любого западного издания, почти не описано. …Не секрет, что интернет-журналистика использует “перевёрнутую пирамиду” в качестве базовой структуры в силу своей технологической специфики, однако технология такого письма зачастую остаётся методологической загадкой, которую каждый разгадывает по-своему» [Тамсама, с. 9–10].

Прафесар А. Р. Самарцаў слушна канстатуе, што журналісцкая практыка часта апярэджвае тэорыю: інфармацыя ў глабальнай сетцы і ў расійскім яе сегменце пішацца і афармляецца ў агульнапрынятым стылі «перавёрнутай пірамiды», гэтак пішуць і ўсе інфармацыйныя агенцтвы. «Хэдлайн, лид, корпус – традиционная структура современного текста, составляющая перевёрнутую пирамиду, тем не менее остаётся “за кадром отечественных учебных дисциплин”» [100, с. 10]. (У 2007 годзе мною быў уведзены «ў кадр» нашай беларускай журналіцкай навукі тэрмін *хедлайн* (праз *е*) у артыкуле пад назвай «Хедлайн. Сэнсавая і граматычная структура».)

На жаль, зазначае вучоны, шматлікім паняццям заходняй журналістыкі цяжка падабраць рускія аналагі. «Множество споров вызывают такие термины, как ХЭДЛАЙН (headline), его многие путают с заголовком, или ЛИД (lead), которому приписывают совершенно различные и часто ошибочные функции», – адзначае А. Р. Самарцаў. Разам з тым аўтар падручніка таксама заблытаўся ў інтэрпрэтацыі тэрміна *хэдлайн*, які, піша аўтар, «многие путают с заголовком». Пры ўсім гэтым у яго кнізе чытаем: «Хэдлайн – см. заголовок. “Смотрим”: Заголовок (headline) – часть текста, в которой содержится главная мысль произведения». Далей у тэксце кнігі на с. 302 у параграфе «Почему **хэдлайн не заголовок**» чытаем: «Хэдлайн может выполнять множество различных функций, и заголовка в том числе, однако заголовок только одна из его ролей» [Тамсама, с. 302]. Зыходзячы з гэтага аўтару трэба было напісаць: «*Хэдлайн не толькі загаловак*».

Ад загалоўка не патрабуецца выражэння галоўнай думкі – гэта функцыя хэдлайна, заўважае даследчык. Паводле маіх даследчых назіранняў, для загалоўка і не забараняецца выражаць галоўную думку. І калі ў ім гэта думка выражана, дык такі загаловак мы справядліва назавём *хэдлайнам* [52, с. 29].

Такім чынам, выкарыстоўваючы нетрадыцыйныя для нас тэрміналагічныя паняцці заходняй журналістыкі, яшчэ неўпарадкаваныя, даследчык павінен акрэсліць зместавыя параметры тэрміна. Да прыкладу: «тэрмін *хэдлайн* намі выкарыстоўваецца ў дачыненні да загалоўка, які ўтрымлівае галоўную думку тэксту, інакш кажучы, да загалоўка-факта, кшталту: Прэзідэнт Егіпта пайшоў у адстаўку; Радыяцыйны фон Японіі ў норме і інш. У астатніх выпадках функцыянуе тэрмін *загаловак*».

## ТЭРМІН ЯК «КАНТЭКСТНА НЕРУХОМАЯ» ЛЕКСІЧНАЯ АДЗІНКА

Як ужо адзначалася, любы тэрмін у канкрэтнай тэрмінасферы павінен мець дакладна акрэслены змест, незалежны ад кантэксту. Тэрмін у сваім значэнні «кантэкстна нерухомы», адзначаюць даследчыкі. Тым не меней нават у традыцыйную, навукова ўпарадкаваную тэрмінасферу часам пранікаюць хлуслівыя ноты, здольныя разбурыць увесь тэрміналагічны парадак, які склаўся на падставе векавога досведу. Да прыкладу. (Можна было б абмінуць гэты пасаж, калі б ён не крануў непасрэдна нашу, журналісцка-рэдактарскую, навуку.) Апошнім часам у тэрмінасістэму літаратурнага рэдагавання ўкраліся паняцці «*аўтарскае рэдагаванне*», «*самарэдагаванне*», «*самарэцэнзаванне*». Ды не ў метафарычным, пераносна-вобразным значэнні, кшталту «сам сабе рэжысёр», «сам сабе рэцэнзент», а ў значэнні *тэрміналагічным*: пісьменнік як творца атрымаў назву *пісьменніка-рэдактара*, *пісьменніка-рэцэнзента ўласных твораў*. Напрыклад: «*Авторское редактирование* публицистики Олеся Гончара как источники изучения вопросов *саморедактирования писателя*»; «Эпистолярий и дневниковые записи Олеся Гончара как источники изучения вопросов *саморедактирования писателя*» (вылучана намі. – *М. К.*). (Звернем увагу на фармулёўку прадмета даследавання: «источники изучения вопросов *саморедактирования писателя*» – пісьменнік, а не твор, стаў прадметам рэдагавання самога сябе.) Менавіта новыя варыянты публіцыстычных твораў Алеся Ганчара, падрыхтаваныя ім праз шэсць гадоў пасля атрымання Украінай незалежнасці для выдання свайго зборніка, склалі прадмет навуковага інтарэсу даследчыка. Гаворка павінна была ісці пра «публицистику Олеся Гончара в авторской редакции», гэта значыць, у аўтарскім варыянце, «получившемся в результате переработки произведения автором», а не пра «авторское редактирование», якога не можа быць ні ў гэтай сітуацыі, ні ў іншай «по определению».

Мы не знойдзем сёння ні ў навуковых крыніцах, ні ў падручніках па рэдагаванні сінтаксічнай формулы «рэдагаваць самога сябе». Даследчык дазволіў сабе сваё «навуковае» дасягненне раздзяліць са знакамітымі вучонымі: маўляў, «фрагментарно отдельные вопросы

*саморедактирования* рассматриваются в работах таких исследователей, как Н. Сикорский, А. Мильчин, М. Феллер». У навуцы такія ўчынкі недапушчальныя. Насамрэч, доктар філалагічных навук прафесар М. М. Сікорскі, абагульняючы сваю шматгадовую навуковадаследчую, выкладчыцкую працу, вопыт рэдагавання ў выдавецтвах «Наука», «Книга», ніколі не змешваў такога ключавога паняцця, як *рэдактарская дзейнасць* класікаў рускай літаратуры, з паняццем *творчая*, *літаратурная дзейнасць* як бясконцая праца пісьменніка па ўдасканаленні тэксту ўласнага літаратурнага твора. Дастаткова разгарнуць яго фундаментальны падручнік «Теория и практика редактирования» [105] і прачытаць назвы глаў, каб пераканацца, што ў полі зроку аўтара падручніка быў, з аднаго боку – *рэдактарскі* вопыт класікаў рускай літаратуры ў падрыхтоўцы **чужых** твораў да друку, а з другога – іх *літаратурны* вопыт як «неутомимый труд писателя над слогом: "Надо, главное, не торопиться писать, не скучать поправлять, переделывать 10, 20 раз одно и то же"; "Надо навсегда отбросить мысль писать без поправок, 3, 4 раза – это ещё мало"», – раіў Л. М. Талстой маладым літаратарам. Але талстоўскае «не скучать поправлять» не азначае «не скучать редактировать себя»: пісьменніцкае «поправлять» мае іншую прыроду. Сам пісьменнік «Войну и мир» перарабляў сем разоў, «Анну Каренину» – адзінаццаць, «Воскресение» мае шэсць рэдакцый, партрэт Кацюшы Маславай у канчатковай *рэдакцыі* (не рэдагаванні!) у 16 радкоў перарабляўся 20 разоў. А. П. Чэхаў: «…*Я* занят, занят по горло: пишу и зачёркиваю, пишу и зачёркиваю»; «Рукописи всех настоящих мастеров испачканы, перечёркнуты вдоль и поперёк, потёрты и покрыты латками» і г. д. Але ні пісьменнікам, ні даследчыкам не прыходзіла ў галаву нястомную творчую працу над уласным творам назваць «самарэдагаваннем». Сутнасць *рэдактарскай* дзейнасці класікаў рускай літаратуры заключалася ў тым, што многім з іх даводзілася рэдагаваць часопісы «Современник», «Отечественные записки», «Полярная звезда», «Колокол», «Руская мысль» і інш. і адчуваць пры гэтым, як пісаў Талстой, «подъём большой сил физических и умственных». «Приятно скромно *безлично* (вылучана намі. – *М. К.*) работать», – тонка абазначыў Талстой асаблівасць рэдактарскай працы ў тым сэнсе, што імя рэдактара заставалася «за кадрам». У сваю чаргу А. С. Пушкін, у якасці аўтара літаратурных

твораў, працу над імі ўжо ў завершанай стадыі называў «редко замеченным трудом отделки и отчётливости». Сучасныя псеўдадаследчыкі, без сумневу, назвалі б яго «труд» «самарэдагаваннем», чаго Пушкін ні ў якім разе не здолеў бы патлумачыць. Бо як рэдактар «Современника», чытаючы аўтарскія рукапісы, даючы парады аўтарам, робячы заўвагі на палях, напрыклад Пятру Андрэевічу Вяземскаму з нагоды яго «витиеватого слога»: «Да говори просто – Ты довольно умён для этого» і інш., добра спазнаў, што такое *рэдактарская* дзейнасць, а што – дзейнасць аўтарская, аўтарскае шліфаванне тэксту. «Уж явно не саморедактирование!» – абурана «воскликнул бы» паэт.

Можна бясконца пераконваць маладых даследчыкаў, што, калі пісьменнік заменіць адно слова на другое, гэта не называецца рэдагаваннем. Гэта штосьці іншае: «Есть сила благодатная в созвучье слов живых, и дышит непонятная святая прелесть в них» (М. Ю. Лермантаў). «Непонятная» часам нават самому аўтару, творцу. І гэта пацвердзіць любы пісьменнік. Пераканаўча пацвердзіў і доктар філалагічных навук прафесар Міхась Яўгенавіч Цікоцкі сваімі навуковымі даследаваннямі беларускага мастацкага слова, боскага слова беларускіх майстроў (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і шэрагу іншых), адрознага «ад слова ў жыцці» [гл.: 132; 133].

Таму вельмі балюча, калі творчы працэс вялікага ўкраінскага майстра, пісьменніка Алеся Ганчара імянуецца штучнымі, бездапаможнымі ў даследчай журналістыцы словамі «самарэдагаванне», «самарэцэнзаванне». Навукова беспадстаўны і выраз «рэдактарская дзейнасць Якуба Коласа», якою не даводзілася займацца класіку беларускай літаратуры. Недапушчальная падмена паняццяў: пісьменніцкі клопат Я. Коласа пра беларускае слова, яго спрэчкі з гэтай нагоды з таленавітымі беларускімі пісьменнікамі прымаюцца за рэдактарскую дзейнасць, за «аўтарскае рэдагаванне». Іншая рэч, скажам, рэдактарская дзейнасць Андрэя Макаёнка, вялікага беларускага драматурга і незабыўнага галоўнага рэдактара часопіса «Нёман». «Сумую па такім рэдактару…» – артыкул вядомага публіцыста Анатоля Казловіча пра Макаёнка-рэдактара, «які сваім рэдагаваннем прыносіў людзям аўтарскае шчасце» (ЛіМ. 1986. 28 ліст.). (Макаёнка-рэдактара, на вялікі жаль, даўно ўжо з намі няма. А зусім нядаўна не стала і знакамітага публіцыста Анатоля Казловіча.)

Слова «рэдагаваць» вельмі прывабнае ў нашым лексіконе: «адрэдагуйце слова», «адрэдагуйце сказ», «адрэдагуйце прозвішчы ў тэксце»… Але ж яго выкарыстанне патрабуе прывабнага прафесіяналізму: *рэдагуецца тэкст твора*, які рыхтуецца да друку. Памылковыя словы, прозвішчы, сказы ў тэксце *не рэдагуюць*, *а папраўляюць*, *выпраўляюць*.

Французскі вучоны Ш. Балі, характарызуючы спецыфіку навуковага маўлення, зазначаў, што *тэрміны* ў галіне лексікі і *формула* ў галіне сінтаксісу з'яўляюцца тымі ідэальнымі тыпамі моўнага выражэння, да якіх непазбежна імкнецца *навуковая мова*.

Выходзіць, што журналістаў, рэдактараў, даследчыкаў даводзіцца часам у гэтым пераконваць.

# Частка V
# ДАВЕДАЧНЫ АПАРАТ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ

Даведачны апарат у прафесійным асяроддзі лічыцца адным з важных элементаў кніжнага выдання. Дыпломная работа – гэта нявыдадзеная кніга, якая па структурна-зместавым характары, як было ўжо адзначана, мае шмат агульнага з рукапісам навуковага твора, што рыхтуецца да друку, і, вядома ж, не абыходзіцца без даведачнага апарату. У дыпломнай рабоце даведачны апарат выконвае тую ж інфармацыйна-пошукавую функцыю, што і ў кніжным выданні: арыентуе чытача ў зместавай структуры навуковай працы. Асноўны пошукавы элемент твора – ***змест***; звязваюць дыпломнае даследаванне з крыніцамі навуковай інфармацыі, вызначаюць іх месца ў даследаванні тэмы дыпломнай работы ***спіс выкарыстанай літаратуры*** і ***бібліяграфічныя спасылкі*** ў тэксце; пацвярджае дакладнасць («достоверность») вынікаў даследавання ў выглядзе табліц, графікаў, схемаў, анкет, архіўных матэрыялаў і інш. ***дадатак***.

Даведачны апарат дыпломнай работы ўтрымлівае і такі элемент, як ***выхадныя звесткі***: дзе падрыхтавана дыпломная работа, кім падрыхтавана, калі, яе назва, хто кіраўнік, рэцэнзент – у дыпломнай рабоце гэта інфармацыя месціцца на ***тытульным лісце***, на вонкавым баку. Ролю прадмовы ці ўступнага артыкула, якія таксама лічацца элементамі даведачнага апарату, у дыпломнай рабоце выконваюць ***уводзіны***. Хаця яны цесна звязаны са зместам даследавання, але ў структуру асноўнага тэксту як носьбіта навуковай інфармацыі не ўваходзяць. *Асноўны тэкст* пачынаецца з ***глаў*** і заканчваецца ***заключэннем***.

***Даведачны апарат дыпломнай работы – найпершае ўяўленне пра ўзровень не толькі яе афармленчай культуры, але і творчай, пра ўзровень даследчай культуры яе аўтара.*** Даведачны апарат – вельмі важны элемент культуры дыпломнага твора ў цэлым. Пра гэта нельга забываць.

Апісанне кожнага элемента даведачнага апарату падаецца ў той паслядоўнасці, у якой ён праходзіць у дыпломным даследаванні: тытульны ліст, змест, скарачэнні, уводзіны, бібліяграфічны спіс і бібліяграфічныя спасылкі, дадатак.

Узоры афармлення некаторых складнікаў (элементаў) даведачнага апарату ўжо прыводзіліся ў працэсе выкладу папярэдняй інфармацыі. Прыводзім узоры астатніх элементаў.

## УЗОР ТЫТУЛЬНАГА ЛІСТА ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ ВЫПУСКНІКА ФАКУЛЬТЭТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**
**Факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў**

**Абласная і гарадская газеты ў сучаснай інфармацыйнай прасторы («Гродзенская праўда» і «Вечерний Гродно»)**

Дыпломная работа
слухача спецыяльнасці
«Сродкі масавай інфармацыі»
КУЛЕШ Алены Уладзіміраўны

Навуковы кіраўнік –
канд. філал. навук дацэнт
КАСЬКО Уладзімір
Канстанцінавіч

Рэцэнзент –
канд. філал. навук дацэнт
ДУБОВІК Сяргей Валянцінавіч

Мінск
2010

# АФАРМЛЕННЕ НАВУКОВЫХ КРЫНІЦ У «СПІСЕ ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ» (КНІЖНЫЯ ВЫДАННІ, АСОБНЫЯ АРТЫКУЛЫ Ў КНІЗЕ, ГАЗЕЦЕ, ІНТЭРНЭЦЕ І ІНШ.)

**1. Кніжнае выданне:**

***а) адзін аўтар*:**

*Самарцев, О. Р.* Творческая деятельность журналиста: очерки теории и практики: учеб. пособие / О. Р. Самарцев; под общ. ред. Я. Н. Засурского. – 2-е изд. – М.: Акад. проект: Гаудеамус, 2009. – 528 с.

*Фролова, Т. И.* Социальная журналистика и её роль в общественном диалоге: учеб. пособие / Т. И. Фролова. – М.: Пульс, 2003. – 44 с.

***б) да трох аўтараў*:**

*Барабаш, Н. С.* Радиожурналистика: учеб. для вузов / Н. С. Барабаш, Л. Д. Болотова, В. В. Гаспарян. – 3-е изд., испр. и доп. – М.: Изд-во Моск. ун-та: Наука, 2005. – 477 с.

***в) чатыры аўтары і болей*:**

Культурология: учеб. пособие для вузов / С. В. Лапина [и др.]; под общ. ред. С. В. Лапиной. – 2-е изд. – Минск: ТетраСистемс, 2004. – 495 с.

Редакторская подготовка изданий: учебник / С. Г. Антонова [и др.]; под ред. С. Г. Антоновой. – М.: Логос, 2004. – 496 с.

(Такія выданні размяшчаюцца ў «Спісе» ў алфавітным парадку – паводле першай літары наймення выдання.)

***г) матэрыял са збору уласных твораў аўтара*:**

*Гілевіч, Н.* Сон у бяссонніцу / Н. Гілевіч // Зб. тв.: у 23 т. – Мінск, 2003. – Т. 6. – С. 382–383.

**2. Артыкулы з матэрыялаў канферэнцый і зборнікаў новых прац:**

а) *Фрольцова, Н.* Знаковая структура современной медиасферы и новые модели журналистики / Н. Фрольцова // Журналістыка-2010: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 12-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 снеж., 2010 г. / рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 12. – Мінск: БДУ, 2010. – С. 32–34.

*Карповіч, М.* Мова і маўленчы прафесіяналізм (з тэорыі, уласнага вопыту і назіранняў) / М. Карповіч // Мова – Літаратура – Культура: матэрыялы VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 28–29 кастр. 2010 г.: у 2 ч. Ч. 1 і Ч. 2 / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2011. – С. 29–40.

б) *Басава, Г.* Міжасобасны дыскурс як духоўнае вымярэнне быцця ў кантэксце міжкультурнай камунікацыі / Г. Басава // Слова ў кантэксце часу: да 80-годдзя доктара філал. навук прафесара Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча: зб. навук. прац; пад агул. рэд. В. І. Іўчанкава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – С. 44–49.

в) Аўтарскія артыкулы ў вучэбных дапаможніках, кожны раздзел якіх складаецца з тэматычных аўтарскіх артыкулаў.

*Артамонова, Ю. Д.* Текст СМИ в современной культуре: опыт философского анализа / Ю. Д. Артамонова // Язык средств массовой информации: учеб. пособие для вузов / под ред. М. Н. Володиной. – М.: Акад. проект: Альма Матер, 2008. – С. 248–264.

**3. Артыкулы з перыядычных выданняў:**

***а) з часопіса:***

*Зелянко, С. В.* Інтэртэкстуальны эфект журналісцкай дзейнасці / С. В. Зелянко // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2007. – № 1. – С. 117–122.

***б) з газеты:***

*Трофимович, А.* Овладей языком. Переводчики помогут продвинуть Беларусь / А. Трофимович // Аргументы и факты в Белоруссии. – 2011. – 25 янв. – С. 12.

**4. Артыкулы з энцыклапедый і слоўнікаў:**

а) *Говін, С. В.* Наш голас / С. В. Говін // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск: БелСЭ, 1971. – Т. 4. – С. 462.

б) *Месникова, Л. А.* Природа человека / Л. А. Месникова // Современный философский словарь; под общ. ред. В. Е. Кемерова. – М., 2004. – С. 550–553.

**5. Архіўныя матэрыялы і заканадаўчыя:**

а) Дела о выдаче ссуды под залог имений, находящихся в Минской губернии (имеются планы имений) 1884–1918 гг. // Центральный исторический архив Москвы (ЦИАМ). – Фонд 255. – Оп. 1. – Д. 802–1294, 4974–4978, 4980–4990, 4994–5000, 5015–5016.

**6. Інтэрнэт-крыніцы:**

*Лямзина, Т. Ю.* Жанр эссе (к проблеме формирования теории) / Т. Ю. Лямзина [Электронный ресурс]. – Режим доступа: psujourn.narod.ru/lib/liamzina_essay.htm. – Дата доступа: 23.04.2010.

*Муравьева, А. А.* Эссе / А. А. Муравьева [Электронный ресурс]. – Режим доступа: zhurnal.lib.ru/m/murawxewa_a_a/esse.shtml. – Дата доступа: 12.07.2010.

*Степанов, Т. М.* Жанр эссе в отечественном и зарубежном литературоведении 1960–1980 годов / Т. М. Степанов [Электронный ресурс]. – 2006. – Режим доступа: conf.stavsu.ru/conf.asp?reportid=477. – Дата доступа: 11.06.2010.

**7. Крыніцы на замежных мовах:**

Essay // The World Book Encyclopedia (International). – London; Sydney; Tunbringe; Wells; Chicago, 1994. – V. 6: E. – P. 330.

*Karatkewitsch, U.* Land unter wissen Flugeln: Essay / U. Karatkewitsch; übers. U. Tschapeha. – Minsk, 1983.

*Terrasse, J.* Rhetorique de l'essai litteraire / J. Terrasse. – Montreal, 1977.

*Tompson, E. M.* Trubadurzy imperium / E. M. Tompson; przekł. A. Sierszulska. – Kraków, 2000.

З а ў в а г а. У «Спіс выкарыстанай літаратуры» ўключаюцца толькі тыя літаратурныя крыніцы, на якія спасылаецца аўтар дыпломнай работы ў тэксце. Яны абазначаюцца ў квадратных дужках: [12, с. 6] – калі падаецца цытата; [гл.: 12] альбо [гл.: 12, с. 6–18] – калі даецца адсылка да крыніцы ў цэлым ці да яе часткі. Кропка ставіцца пасля квадратных дужак, а не перад імі. Спіс складаецца ў алфавітным парадку. Крыніцы на замежных мовах (у лацініцы) падаюцца апошнімі і ў алфавітным парадку.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ Ў ТЭКСЦЕ (АФАРМЛЕННЕ)

Бібліяграфічныя спасылкі на навуковую крыніцу ў тэксце дыпломнай работы выглядаюць, да прыкладу, так: А. Тэртычны піша: «Вся масса созданных в журналистике произведений распределяется на основе целого ряда принципов деления» [37, с. 5]. Першая лічба – гэта нумар бібліяграфічнай крыніцы ў «Спісе выкарыстанай літаратуры», другая лічба – старонка ў названай крыніцы, на якой месціцца прыведзеная цытата.

Калі тэкст навуковай крыніцы не цытуецца, а раскрываецца сутнасць яго зместу, тады спасылка на навуковую крыніцу выглядае так: [гл.: 16, с. 7–12]. Калі спасылка на адну і тую ж крыніцу выпадае на старонцы дыпломнага тэксту некалькі разоў, дык пішам: [Тамсама, с. 10].

### Спасылка ў тэксце на газетнае і часопіснае выданні

Спасылка на газетнае выданне ці на часопіснае, калі яно не занесена ў «Спіс выкарыстанай літаратуры», у тэксце дыпломнай работы бярэцца ў круглыя дужкі і выглядае так: (Рэспубліка. 2011. 15 сак.). Калі ў газетным выданні болей за 8 старонак, пасля даты пазначаецца нумар старонкі: (АиФ в Белоруссии. 2011. 6 апр. С. 12). Тэма газетнага матэрыялу, яго аўтар месцяцца ў дужках: (Анна Крючкова. Всесоюзные стройки. Неизвестное восстание в Темиртау // АиФ в Белоруссии. 2011. 6 апр. С. 32).

У спасылцы на часопіснае выданне абазначаецца яго нумар: (Полымя. 2010. № 6. С. 15).

